УСПАМІНЫ ФРАНТАВІКА 8





ЯК ПЛАНАВАЦЬ, КАБ ГЭТА БЫЛО ЭФЕКТЫЎНА? 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 СТУДЗЕНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 2 (30136)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Міністэрствам адукацыі праводзіцца падрыхтоўчая работа па правядзенні ў 2024 годзе цэнтралізаванага экзамену, вынікі якога будуць залічвацца пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі. Так, 27 студзеня 2024 года адбудзецца рэпетыцыя цэнтралізаванага экзамену. Агульныя прынцыпы правядзення рэпетыцыі — пункты правядзення, пропуск у пункт правядзення, рассадка ў аўдыторыях, правілы правядзення і гэтак далей — ідэнтычныя прынцыпам, якія выкарыстоўваюцца пры арганізацыі і правядзенні цэнтралізаванага экзамену. Для правядзення рэпетыцыйнага экзамену будуць задзейнічаны тыя ж пункты правядзення, на якіх адбудзецца сам цэнтралізаваны экзамен, — 144 пункты. Плануецца, што ў рэпетыцыі прымуць удзел каля 58 тысяч выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, што на 5 тысяч больш у параўнанні з 2023 годам».*

## КОРАТКА

• Больш за тры тысячы працоўных месцаў прапануюць на электронным кірмашы вакансій у Мінску.

• **Кампанія АВС завявала адразу 13 узнагарод прэміі «Лідар спажывецкага рынку — 2023».**

• Беларусь выйшла ў лідары сярод краін СНД у рэйтынгу дасягнення Мэт устойлівага развіцця.

• **Новую залеж чорнага золата знайшлі ў Гомельскай вобласці.**

• За 11 месяцаў 2023 года вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі павялічылася на пяць працэнтаў.

ISSN 1990 — 763X

Гонар краіны

# ПАТРЫЁТЫ З ПОЛАЦКАЙ ПРАПІСКАЙ

**Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне»**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

**Гэтая высокая ўзнагарода прысуджана калектыву Полацкага кадэцкага вучылішча за плённую дзейнасць у грамадзянска-патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення. Настаўнікі і афіцэры-выхавацелі сціпла заўважаюць, што яны проста робяць сваю справу. І з гэтым, як кажуць, не паспрачаешся. Але як яны яе робяць! Адзін той факт, што ўсе без выключэння хлопцы і дзяўчаты, якія вучацца тут, не проста мараць пра афіцэрскія пагоны, а ўпэўнена крочаць да гэтай мэты, сведчыць аб многім. Практычна 90 % выпускнікоў кадэцкага вучылішча штогод паступае ў вышэйшыя навучальныя ўстановы сістэмы нацыянальнай бяспекі краіны.**

Сімвалічна, што Полацкае кадэцкае вучылішча знаходзіцца побач са святыняй рускага праваслаўя — Сафійскім саборам. Царква заўсёды была заступніцай воінства, благаслаўляла адважных сыноў на абарону Айчыны. У гэтае маляўнічае месца на беразе Заходняй Дзвіны вучылішча пераехала 1 верасня мінулага года — можна сказаць, вярнулася на гістарычную радзіму. Менавіта тут размяшчалася найстарэйшая ваенна-навучальная ўстанова царскай Расіі — Полацкі кадэцкі корпус, створаны ў 1835 годзе. На традыцыях, закладзеных яго навучэнцамі, і выхоўваюцца сённяшнія полацкія кадэты, якія па праве лічацца правапераемнікамі сваіх легендарных папярэднікаў.

### Тры задачы — тры рашэнні

Полацкае кадэцкае вучылішча адчыніла свае дзверы ў верасні 2010 года. Гэта стала магчымым дзякуючы Указу Прэзідэнта «Аб кадэцкіх вучылішчах», якім у Беларусі была створана сістэма кадэцкай адукацыі. У выніку аналагічныя навучальныя ўстановы з'явіліся ў сталіцы і ва ўсіх абласных цэнтрах.

СТАР. 5

Дзяржаўны інтарэс

# Электробусы, дамы, майнінг

## Уся электраэнергія ад АЭС ужываецца ў краіне і працуе на эканоміку

**Першая чарга ўзвядзення Рэспубліканскага пункту захоўвання і захавання радыеактыўных адходаў павінна быць завершана ўжо да 2030 года, а на перапрацоўку ў Расію ядзерныя адходы пачнуць адпраўляць ужо ў 2031—2032 гадах. У стадыі прапрацоўкі таксама пытанне, ці патрэбна Беларусі яшчэ адна атамная станцыя або трэці энергаблок. Пра абыходжанне з адпрацаваным ядзерным палівам, электратранспарт і сферы ўжытку электраэнергіі ад АЭС расказалі спецыялісты энергетычнай галіны.**

СТАР.4



Фота Ірыны СІДАРОК

Нашы дзеці

# «Адчуваю сябе сапраўднай прынцэсай»

## Малыя госці Палаца Незалежнасці апынуліся ў казцы




**У першыя працоўныя дні новага года галоўныя госці Палаца Незалежнасці — дзеці. Па традыцыі новы год тут пачынаецца з дзіцячага смеху, добрага настрою і казачнай атмасферы. На святочныя ранішнікі ў Палац Незалежнасці запрашаюцца дзеці сацыяльна ўразлівых катэгорый, выхаванцы дзіцячых дамоў і дамоў сямейнага тыпу, школьнікі, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучобе, спорце, грамадскай дзейнасці. Гэта ўжо традыцыя. І па традыцыі кожны ўдзельнік свята атрымлівае падарунак ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.**

Тыдзень таму ў Зале святочных цырымоній панавала элегантнасць мужчынскіх фракаў і зіхацелі жаночыя ўпрыгажэнні — тут прайшоў традыцыйны маладзёжны баль. Дэкарацыі, створаныя, спецыяльна для гэтага мерапрыемства, пераносілі ўдзельнікаў на некалькі стагоддзяў таму, калі бальная культура была ў росквіце. А праз тыдзень дэкарацыі Залы святочных цырымоній пераносілі ўсіх у казку — тут вырас сапраўдны чароўны гарадок з мілымі заснежанымі хаткамі і пухнатымі ялінкамі. Менавіта ў гэтыя дні ў Палацы Незалежнасці пад адным дахам сустракаюцца дзяржаўныя асобы ў строгіх касцюмах і казачныя героі — і ўсе адчуваюць сябе ўтульна. Нездарма Палац Незалежнасці з'яўляецца не толькі палітычнай, але і культурнай пляцоўкай, адкрытай для беларусаў розных узростаў і занятказ. У першыя дні 2024 года яго наведаюць больш за 500 дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі і Літвы.

«Сёння было вельмі цікава, казка была смешная. І тут вельмі прыгожа. А яшчэ я паспеў зрабіць прыгожую свечку, і мне сказалі, што ў мяне найлепшая свечка за сёння. Я вельмі добра адсвяткаваў Новы год, гуляў з братам усю ноч. Але за 20 хвілін да Новага года ніяк не мог яго дачакацца. І вось дачакаўся, свята працягваецца», — падзяліўся Уладзіслаў Жук.

Забавак для маленькіх гасцей — болей чым дастаткова. Для спартсменаў — інтэрактыўны лабірынт, настольны футбол, сіламер. Для аматараў творчасці дзейнічаюць «майстэрні чараўнікоў», дзе праводзяцца майстар-класы па вырабе навагодніх паштовак, калядных свечак, чароўных масак. Для тых, хто, нягледзячы на юны ўзрост, не ўяўляе сябе без сацыяльных сетак, усталяваны фотазоны з дапоўненай рэчаіснасцю, цуд-шар, фотабудка ў выглядзе тэлефона. Для таго каб фота атрымліваліся неардынарнымі, кожны можа зрабіць сабе аквагрым. Сумна тут быць не можа.

«Я вельмі хацела апынуцца на гэтым свяце. Ужо зрабіла паштоўку для бабулі, напісала ёй віншаванне, каб яно яе грэла ў халодныя дні. Я вельмі доўга рыхтавалася да гэтага свята, прыйшлося выбіраць сукенку, гэта было вельмі няпроста, але мне падабаецца быць у прыгожай сукенцы ў такой чароўнай зале. Адчуваю сябе сапраўднай прынцэсай», — расказала журналістам Мілана Сураваіцкая.

Ключавы момант свята — казачнае прадстаўленне «Навагоднія прыгоды», якое распавядае аб прыгодах Дзеда Мароза. З сябрамі чараўнік ратуе сваю ўнучку Снягурку ад Заморскага Цмока, а разам з ёй і Новы год. Галоўная ідэя казкі, па словах рэжысёра Уладзіславы Арцюхоўскай, у паказе значнасці беларускіх і славянскіх традыцый, заснаваных на сіле адзінства народа і сяброўства, важных чалавечых якасцяў — смеласці і рашучасці для абароны міру на зямлі.

Школьніцы з Мінска Веранiка Дзяруга і Мілана Скрыпко на свяце ўжо не першы раз, але кожны раз для іх асаблівы. Дзяўчаткам спадабаўся аквагрым, і, канешне, яны не змаглі не нарабіць мноства сэлфі ў інтэр'ерах Палаца Незалежнасці. «Такое адчуванне, што свята не заканчваецца. Гэта адназначна найлепшыя канікулы, бо не кожнаму школьніку шанцуе пабываць на такім свяце», — падзяліліся дзяўчаты.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Каб паверылі ў цуд

## Сенатар і дэпутаты павіншавалі хлопчыкаў і дзяўчынак з Новым годам і Калядамі



Падчас наведвання дзіцячых дамоў сямейнага тыпу ў Тамашоўцы.

**У рамках рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў сенатар Юрый НАРКЕВІЧ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Яўген ЗАЙЦАЎ, старшыня Брэсцкага райсавета Уладзімір ХВАЦІК са сваімі дэпутатамі накіраваліся ў адзін з самых аддаленых аграгарадкоў Брэсцкага раёна — Тамашоўку, каб павіншаваць юных выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.**

У сям'і Іванюк гасцей чакалі, прыбралі прыгажуню-ёлку, вывучылі вершы, падрыхтавалі песні. І калі пад ёлкай на вачах вырасла цэлая гурба падарункаў, у доме пачалося сапраўднае свята. Дзеці чыталі вершы, атрымлівалі падарункі з рук Дзеда Мароза і Снягуркі, што прыбылі разам з дэпутатамі.

Маці вялікай сям'і Алена Іванюк расказала, што іх дому сямейнага тыпу ўжо 15 гадоў. За гэты час больш за дзесяць чалавек сталі выпускнікамі дома. Некаторыя з іх ужо займелі свае сем'і. Выпускніца Аліна завітала ў госці да бацькоў на навагоднія святы са сваім двухгадовым сынам. Яны разам з сястрой трапілі сюды ва ўзросце чатырох гадоў. Таму Алену Мікалаеўну, якая іх выгадавала, выхавала, лічаць сапраўднай мамай. Як і студэнтка Горкаўскай сельгасакадэміі Вікторыя, якая днямі паведаміла бацькам, што яе здымак змясцілі на дошку гонару навучальнай установы.

Алена Мікалаеўна ганарыцца многімі выпускнікамі, усіх імкнецца выхоўваць годнымі людзьмі. Гасцям яна выказала падзяку за ўвагу, расказала, што яшчэ раней кіраўніцтва раёна аказала дапамогу па замене мэблі. Паводле яе слоў, на любую просьбу ў раёне заўсёды адклікаюцца.

Дому сямейнага тыпу Лідзіі Працэка таксама амаль паўтара дзясятка гадоў. Матуляй Лідзію называюць ужо амаль 30 былых і цяперашніх хлопчыкаў і дзяўчынак. Некаторыя з выпускнікоў працуюць, іншыя вучацца. Цяпер выхаванцаў пяцёра, у доме чакаюць папаўнення.

З цёплымі словамі віншавання да дзяцей і бацькоў звярнуўся Юрый Наркевіч. Пазней ён сказаў журналістам, што ніводнае дзіця на Брэстчыне не застанецца па-за ўвагай дарослых: «У гэтых дзяцей лёсы розныя, у многіх за плячыма недзіцячыя цяжкасці, няпростыя гісторыі, але ўсе яны маюць патрэбу ў любові, спагадзе, бо ўсе дзеці павінны верыць у дабро, справядлівасць і ў цуд на навагоднія святы», — падкрэсліў сенатар.

А дэпутаты Брэсцкага гарадскога Савета на чале са старшынёй Міхаілам Красоўскім наведалі Брэсцкі абласны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Тонус».

«Тонус» — асаблівая ўстанова, яго спецыялісты займаюцца рэабілітацыяй дзяцей з паражэннямі нервовай сістэмы. Па асаблівай праграме тут займаюцца з пацыентамі да трохгадовага ўзросту. Штодня на працэдурах бывае да сотні пацыентаў. Вязуць сюды дзяцей таксама з іншых абласцей краіны. За трыццаць гадоў работы «Тонус» многіх хлопчыкаў і дзяўчынак літаральна паставіў на ногі.

Акрамя традыцыйных салодкіх падарункаў, дэпутаты гарсавета перадалі ўстанове камплекты гульняў, якія неабходныя маленькім пацыентам у працэсе рэабілітацыі. Затым супрацоўнікі «Тонуса» разам з дзецьмі і іх бацькамі зладзілі вясёлае навагоднее прадстаўленне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Іране ў выніку тэракта загінулі больш чым 100 чалавек



Як мінімум 103 чалавекі загінулі і яшчэ 141 пацярпеў у выніку двух выбухаў каля могілак у іранскім горадзе Керман падчас цырымоніі памяці камандуючага сіламі спецыяльнага прызначэння «Аль-Кудс» Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі (КВІР, элітныя часткі Узброеных сіл Ірана) генерала Касема Сулеймані. Пра гэта паведаміла іранскае агенцтва Tasnim. Паводле яго інфармацыі, першы выбух адбыўся за 700 метраў ад магілы Сулеймані, другі — на адлегласці каля кіламетра ад аб'екта. Выбухі прызнаны тэрарыстычным актам. Аб гэтым заявіў намеснік губернатара правінцыі Керман. «Інцыдэнт у Голзар-е Шохада (назва могілак у Кермане, побач з якім адбыўся выбух. — **Рэд.**) з'яўляецца тэрарыстычным актам», — прыводзіць яго словы партал Nour News.

### Дзяржаўны доўг ЗША перавысіў 34 трыльёны долараў



За мінулы год ён узрос на больш чым чатыры трыльёны долараў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на сайт Міністэрства фінансаў ЗША. У студзені мінулага года была перавышана і заканадаўча ўстаноўлена на ўзроўні $31,4 трлн мяжа дзярждоўгу ЗША. Пасля гэтага Міністэрства фінансаў было вымушана задзейнічаць надзвычайныя захады для працягу сваіх фінансавых аперацый. Адміністрацыя Белага дома ў апошнія месяцы заклікала Кангрэс павялічыць ліміт запазычанасці. Кантралюючыя Палату прадстаўнікоў рэспубліканцы былі згодны павысіць мяжу дзяржадоўгу, але пры ўмове значнага скарачэння бюджэтных расходаў. 3 чэрвеня мінулага года прэзідэнт ЗША Джо Байдэн падпісаў ухвалены раней Кангрэсам законапраект аб павышэнні мяжы дзяржаўнага доўгу. Цяпер ліміт будзе дасягнуты 2 студзеня 2025 года.

### Кааліцыя кіруючай партыі Сербіі перамагла на выбарах пасля паўторнага галасавання



Кааліцыя «Аляксандр Вучыч — Сербія не павінна спыняцца» перамагла пасля паўторнага галасавання на парламенцкіх выбарах у Сербіі з вынікам 46,75 працэнта па выніках апрацоўкі 100 працэнтаў бюлетэняў. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на даныя Рэспубліканскай выбарчай камісіі (РВК) Сербіі. Адзначаецца, што ў сувязі са скаргамі на ход выбараў, якія адбыліся 17 снежня 2023 года, РВК прызначыў на 30 снежня паўторнае галасаванне на 35 участках. На муніцыпальным узроўні паўторная працэдура галасавання прайшла на трох выбарчых участках. Паўторнае галасаванне таксама прайшло 2 студзеня яшчэ на васьмі ўчастках. У ходзе галасавання грамадзяне Сербіі выбіралі тэрмінам на чатыры гады 250 дэпутатаў Народнай скупшчыны (аднапалатны парламент), а таксама сваіх прадстаўнікоў у 65 гарадах і муніцыпалітэтах, у тым ліку Бялградзе і аўтаномным краі Ваяводзіна.

Сацыяльны аспект

# ЗДАРОЎЕ ЛЮДЗЕЙ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

## Чым прырасла медыцына Брэстчыны ў канцы года

**Літаральна ў апошнія дні мінулага года ў шэрагу медыцынскіх устаноў Брэстчыны прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, якія сталі своеасаблівым аглядам праведзенай работы па абнаўленні, мадэрнізацыі, папаўненні ўстаноў аховы здароўя новым абсталяваннем і тэхнікай.**

### Абноўленая рэанімацыя

Напрыклад, у Жабінцы, гарадзе-спадарожніку абласнога цэнтра, адкрылі абноўленае аддзяленне анестэзіялогіі і рэанімацыі цэнтральнай раённай бальніцы. Якое значэнне мае названае аддзяленне ў справе правядзення аперацый ды і наогул ратавання жыцця пацыента ў крытычнай сітуацыі, гаварыць не трэба. Тое, што рэанімацыя стала выглядаць па-сучаснаму, не горш чым у сталіцы альбо абласным цэнтры, сведчыць пра ўзровень раённай медыцыны.

На ўрачыстым мерапрыемстве **старшыня Жабінкаўскага райвыканкама Андрэй КУЗЬМІЧ** выказаў падзяку будаўнікам, камунальнікам, якія займаліся мадэрнізацыяй не толькі гэтага аддзялення, але і правялі добраўпарадкаванне тэрыторыі, заасфальтавалі пад'язныя шляхі. Усяго, паводле слоў кіраўніка раёна, было патрачана тры з паловай мільёны рублёў з абласнога і раённага бюджэтаў на паляпшэнне медыцынскай галіны раёна. Працягваецца рамонт хірургічнага і дзіцячага аддзяленняў бальніцы, падыходзіць да завяршэння рамонт паліклінікі.

Падчас адкрыцця была агучана і такая інфармацыя: за год у Брэсцкай вобласці адрамантавана 208 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 69 амбулаторый урача агульнай практыкі, 13 бальніц сястрынскага догляду. Значыць, сельская медыцына не застаецца па-за ўвагай дзяржавы, хоць большасць сродкаў, вядома, укладваецца ў гарадскія ўстановы.

### Яшчэ адна аперацыйная

Скажам, у канцы снежня ў Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі адкрылі новую аперацыйную. Для гэтага ў лячэбнай установе правялі рэканструкцыю аперацыйнага блока, у выніку якой на месцы дэзынфекцыйнага аддзялення з'явілася другая аперацыйная траўматалогіі. Такім чынам, у траўматалагічнага аддзялення ёсць новыя магчымасці. Работы фінансаваліся з дзвюх крыніц — за кошт пазабюджэтных сродкаў, якія зарабіла сама бальніца, і спонсарскай дапамогі. Акрамя таго, з гарадскога бюджэту было выдзелена 80 тысяч рублёў на закупку аперацыйнага стала. На наступны год для новай аперацыйнай закупяць рэнтгенаўскі апарат з электронна-аптычным пераўтваральнікам, наркозны апарат і артаскапічную стойку. Тут стане магчымым правядзенне ў тым ліку высокатэхналагічных аперацый. Дарэчы, установа аказвае экстранную і планавую траўматалагічную дапамогу не толькі жыхарам абласнога цэнтра, але і пацыентам з Брэсцкага, Маларыцкага, Камянецкага, Жабінкаўскага раёнаў.

### Каб дапамога была мабільнай

На цырымонію ўручэння новых аўтамабіляў у Брэсцкую гарадскую паліклініку № 5 за тры дні да новага года прыбылі кіраўнікі медустаноў з усёй вобласці. У снежні было закуплена 55 спецыяльных аўтамабіляў медыцынскай дапамогі. Новыя машыны Geely Standart 1,5 MT дазволяць палепшыць даступнасць і якасць аказання медыцынскай дапамогі жыхарам рэгіёна.

Як вядома, сярод кірункаў работы ўстаноў аховы здароўя — аказанне неадкладнай дапамогі на даму, выезды ўрачэбных брыгад для аказання паліятыўнай дапамогі, выезды ўрачоў-спецыялістаў для правядзення комплексных медыцынскіх аглядаў пацыентаў з абмежаванымі рухальнымі функцыямі, забеспячэнне дзейнасці шматпрофільных міжраённых і абласных устаноў. Для ўсяго пералічанага патрэбны машыны.

Чатыры новыя аўтамабілі атрымала абласная дзіцячая бальніца, для Пінска і Пінскага раёна закуплена пяць аўтамабіляў, медыкі Пружаншчыны атрымалі два новых аўто, папоўнілі аўтапарк установы іншых райцэнтраў, а таксама Брэсцкая абласная бальніца.

Падчас уручэння машын **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** адзначыў, што ў сферы аховы здароўя дасягнуты неблагія вынікі, а на наступны год запланавана будаўніцтва і рэканструкцыя многіх медустаноў. Аб здароўі людзей як прыярытэце ўлады на месцах гаварыў губернатар і на выніковым пасяджэнні аблвыканкама. На пасяджэнні, напрыклад, прагучала, што ў 2024 годзе плануецца паставіць камп'ютарныя тамографы ў Іванаўскую, Івацэвіцкую, Пружанскую райбальніцы. Чакаюцца пастаўкі 25 аўтамабіляў хуткай дапамогі. Наперадзе — вялікая работа па будаўніцтве і рамонце ўстаноў аховы здароўя. Будзе працягнута будаўніцтва корпуса Брэсцкай абласной бальніцы, рэканструкцыя лячэбнага корпуса Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы. Вылучана фінансаванне на капітальны рамонт Пінскай дзіцячай бальніцы, рамонт бальніцы ў Мікашэвічах, рэканструкцыю філіяла Давыд-Гарадоцкай бальніцы. Вялікі аб'ём работы запланаваны ва ўстановах аховы здароўя Баранавіч.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Навука — у жыццё

# Прарыўныя вынікі акадэмічнай навукі

## НАН Беларусі агучыла «ТОП-10» вынікаў дзейнасці акадэмічных вучоных за 2023 год

1. Аддзяленнем фізікі, матэматыкі і інфарматыкі Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава выяўлены прамы і зваротны эфект у працэсе Швінгера ўтварэння электрон-пазітронных пар у звышмоцных электрычных палях.

2. Распрацаваны ўзмацняльнікфарміравальнік імпульсаў току накачкі лазерных дыёдаў для радыёлакацыйных датчыкаў (Мінскі НДІ радыёматэрыялаў НАН Беларусі, Аддзяленне фізікі, матэматыкі і інфарматыкі).

3. Створана тэхналогія вырабу звышправодзячых высокачастотных ніёбіевых рэзанатараў паскаральнікаў электронаў і пратонаў (Фізіка-тэхнічны інстытут НАН Беларусі, Аддзяленне фізіка-тэхнічных навук).

4. Устаноўлены сінергізм новых вытворных ізатыязолу ва ўзаемадзеянні з субстанцыямі супрацьпухлінных прэпаратаў «першай лініі», якія забяспечваюць узмацненне цытатаксічнага дзеяння і павышэнне эфектыўнасці хіміятэрапіі раку (Інстытут фізіка-арганічнай хіміі НАН Беларусі, Аддзяленне хіміі і навук аб Зямлі).

5. Распрацавана метадалогія павышэння дакладнасці доўгатэрміновых гідраметэаралагічных прагнозаў і канкрэтызацыі верагоднасці фарміравання катастрафічных паводак на рэках (Інстытут прыродакарыстання НАН Беларусі, Аддзяленне хіміі і навук аб Зямлі).

6. Устаноўлена папуляцыйна-генетычная структура і прырода рассялення іксодавых кляшчоў на тэрыторыі Беларусі (Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах, Аддзяленне біялагічных навук).

7. Распрацаваны сінтэз эфектыўных імунагенных арыгінальных пептыдных блакатараў пранікнення віруса грыпу ў клетку як аснова новай стратэгіі ў вакцынапрафілактыцы і супрацьвіруснай тэрапіі (Інстытут фізіялогіі НАН Беларусі, Аддзяленне медыцынскіх навук).

8. Выяўлены і даследаваны ўнікальныя гістарычныя аб'екты і артэфакты археалагічнага комплексу на рацэ Менцы (Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў).

9. Створана сістэма ацэнкі пасяўнога матэрыялу і на гэтай базе тэорыя і практыка вывядзення высокаўраджайных сартоў зыходнага трыцікале азімага (Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве, Аддзяленне аграрных навук).

10. Створана электронна-лічбавая і праграмная прылада біяметрычнай ідэнтыфікацыі перадмастытнага стану малочнага статка буйной рагатай жывёлы (Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі, Аддзяленне аграрных навук).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

По сутнасці



# Гэта наш дом

Беларусам ёсць чым ганарыцца. І гэта не прапаганда. Гэта рэчаіснасць. Ну самі палічыце: супраць нас эканамічныя санкцыі — а ВУП падрос, нам замінаюць працаваць на рынках Еўропы — а мы істотна павялічылі тавараабарот, у тым ліку з вялікімі краінамі свету. А з суседняй Расіяй і ўвогуле сальда дадатнае. І гэта ўпершыню ў гісторыі нашых эканамічных стасункаў. А што датычыцца міжнароднай палітыкі, то ніхто, напэўна, не будзе аспрэчваць, што кіраўнік нашай краіны дэманструе проста найвышэйшы пілатаж. Беларускі борт нумар адзін столькі за мінулы год налятаў! І сёлета будзе не менш. Гучны голас ізаляванай Беларусі на ўвесь свет праўдзіва гучаў з планетарных трыбун. А лідар КНР Сі Цзіньпін увогуле адзначыў, што Беларусь і Кітай адказваюць за лёс новага свету. Што палацы арабскіх шэйхаў, што дзверы самітаў еўразійскай інтэграцыі — адкрыты перад нашым Прэзідэнтам. Гэта відавочна.

Беларусам ёсць чым ганарыцца. Нават можна і не паглыбляцца ў геапалітыку і эканамічныя паказчыкі, дастаткова паглядзець навокал і будзе зразумела — беларусам ёсць чым ганарыцца. Вось як яскрава і аб гэтым заўважыў кіраўнік дзяржавы: «Няма міру без стваральнай працы і няма стваральнай працы без міру. Мы ж хочам і заўтра бачыць, як закаханыя пары становяцца сем'ямі, віншаваць бацькоў з нараджэннем малых, радавацца за сяброў і родных, якія дачакаліся ўнукаў і праўнукаў. Гэта і ёсць наш шлях — шлях стварэння, дарога даўжынёю ў жыццё, па якой мы ідзём дзень за днём. Мы ж хочам, каб і ў новым годзе ў кватэрах і дамах было ўтульна і цёпла, на сталах былі смачныя і карысныя прадукты, а за акном заўсёды адкрываўся від на дагледжаныя мірныя вуліцы, дзіцячыя пляцоўкі і зялёныя паркі. Мы хочам бачыць, як развіваюцца нашы гарады, а жыццё ў глыбінцы становіцца больш камфортным і сучасным».

Так, колькі яшчэ нас чакае тых перакрыжаванняў і выпрабаванняў на шляху нашай дзяржаўнасці. Апагеем самых страшэнных і жудасных іспытаў была Вялікая Айчынная. Таму людскасць таксама — гэта ўласцівасць нашага характару. Спачуванне і чуласць — характэрныя яго рысы. Асабліва цяпер, калі так званая цывілізацыя навязвае нам камфармізм, індывідуальнасць і лічбавыя адносіны: грашовыя і ўсеабдымныя стасункі са штучным інтэлектам. А беларусы захоўваюць сваю людскасць. У адносінах і да моладзі, і да людзей у паважным узросце. Ці не заўважылі, што больш ніхто ў Еўропе не гаворыць пра старых людзей. Нібыта забаранілі казаць пра немаўлят і старых. У Беларусі — іншае. Гэта асабліва падкрэсліў кіраўнік дзяржавы: «Для нас важна быць здаровымі, бачыць, як дзеці з радасцю ідуць у дзіцячыя садкі і школы, а ўчарашнія студэнты становяцца сапраўднымі прафесіяналамі. Важна ведаць, што нашы старыя, людзі, якія маюць патрэбу ў асаблівай апецы, акружаны клопатам і ўвагай. Таму дзякуй усім, хто аддае сябе без астатку найскладанейшай працы — з людзьмі, з дня ў дзень апраўдваючы давер мільёнаў сваіх суайчыннікаў».

Сотні і тысячы сцежак вядуць да грандыёзных мемарыялаў і велічных помнікаў. Мне здаецца, памяць пра Вялікую Айчынную па-беларуску ціхая. Кожнага трэцяга страцілі. Беларусы памятаюць сваіх вызваліцеляў. Таму і ганарымся, і дзякуем, і святкуем.

Вось словы Першага: «2024-ы — год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Для нас няма даты больш важнай. Адзначыць юбілей на належным узроўні, так, каб памяць аб героях таго часу жыла вечна, — справа гонару і гарантыя міру ў будучыні. Хутка гэтыя і многія іншыя падзеі імкліва ўваравуцца ў гісторыю краіны. Мы працягнем ствараць, захоўваючы і ўзбагачаючы сваёй творчасцю і талентам культурны здабытак, адстойваючы нацыянальныя інтарэсы, засцерагаючы адвечныя традыцыі і каштоўнасці. Мы будзем рабіць усё, каб наша краіна стала яшчэ больш прыгожай, утульнай і моцнай».

Захопнікі з розных імперый і драпежнікі розных гатункаў пастаянна паласавалі нашу родную зямельку. А цяпер час араць ды сеяць зярняты стваральнай працы. Аляксандр Лукашэнка добразычліва ўзгадаў і тых, хто трымае ў руках мячы, і тых, хто не выпускае з далоняў арала: «Дзякуй вам, працаўнікі! Усім, хто кожны год літаральна вырывае ўраджай з палону непагадзі, корміць нас, апранае і вырабляе запатрабаваныя на сусветных рынках тавары, развівае навуку, тэхналогіі, праектуе і будуе. У мінулым годзе нас спрабавалі паставіць на калені, задушыць эканамічна... Але мы не проста выстаялі, мы ўсебакова развіваліся, рухаючыся да сваёй мэты! І мы можам зрабіць яшчэ больш, ведаючы, што жывём за надзейнай спінай усіх, хто аддана служыць Радзіме і любіць яе. Таму што няма мацнейшага стымулу да развіцця, чым упэўненасць у заўтрашнім дні і ўпэўненасць у бяспецы народа. Людзі ў пагонах, дзякуй вам за мір!»

Што ні кажы, а бяспека зараз — галоўная рыса моцнай дзяржавы. І брыдкі «мэйнстрым» да сілавікоў, які навязвалі нам у 2020-м, змяніўся добразычлівай удзячнасцю. Яны нават ролікі здымаць паспяваюць. Міліцыянеры віншуюць дзяцей, пагранічнікі жартаўліва затрымліваюць Дзеда Мароза (сэнс у тым, што нават казачная асоба граніцу не парушыць).

Але, каб зберагчы той спакой, беларусы павінны адказна падысці да электаральнай кампаніі. Трэба дакладна разумець, што мы будзем выбіраць не проста дэпутатаў, а людзей, якія павінны будуць адказваць на запыты часу. Ад захавання традыцыйнасці да эканамічнага. Не кажучы ўжо пра палітычны суверэнітэт. Святы і будні, радасць і прыемныя клопаты будуць заўжды, калі мы захаваем сябе, свой агульны дом і сваю сям'ю. Калі не забудземся пра сцежку да роднага парога, тады і краіна застанецца брамай неўміручасці. А як гэта зберагчы? Адказ на гэтае пытанне атрыманы ад Прэзідэнта — больш адказна ставіцца да сваіх абавязкаў: «Гэта наш дом. Для кожнага ён пачынаецца з роднага ганка і любімай сям'і, а для ўсіх разам, для адзінай нацыі становіцца непарушнай крэпасцю».

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Электробусы, дамы, майнінг

## ПРАЕКТНЫЯ ЗАТРАТЫ І ГАРАНТЫЙНЫЯ ТЭРМІНЫ

Бяспека і надзейнасць АЭС — галоўная задача энергетыкаў у атамнай сферы, якая выконваецца. Уся электраэнергія, якая выпрацоўваецца станцыяй, ужываецца ў краіне ў поўным аб'ёме, так што аб'ект працуе на эканоміку краіны і ўносіць адпаведныя эфекты ў выглядзе эканоміі прыроднага газу (5,8 млрд м³), скарачэння выкідаў парніковых газаў (больш за 10 млн тон) у наваколле, запэўніў **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ:**

— На ўласную работу БелАЭС патрэбна шмат энергіі, яна з'яўляецца адным з буйных спажыўцоў, аднак для свайго сілкавання бярэ не больш энергіі, чым гэта прадугледжана яе праектнымі характарыстыкамі. Колькасць электраэнергіі, якую БелАЭС выкарыстоўвае на ўласныя патрэбы, з'яўляецца ўдзельнай велічынёй, якая вызначаецца ў працэнтах ад аб'ёму энергіі, якую станцыя выпрацоўвае, і гэты параметр не перавышае праектныя.

На саму станцыю, як і на яе тэхналагічныя сістэмы і абсталяванне, існуе гарантыя, тэрміны якой абазначаны ў генеральным кантракце. Практыка работы на станцыі паказвае карэктнасць і правільнасць рэалізацыі генпадрадчыкам і заказчыкам вызначаных норм гарантыйных тэрмінаў эксплуатацыі.

— Згодна з праектам, закладзены прыкладна 11-месячны цыкл (345 эфектыўных сутак), калі паміж планава-папераджальнымі рамонтамі адзін з энергаблокаў павінен знаходзіцца ў рабоце, і гэты тэрмін вытрымліваецца. Аднак прапрацоўваецца пытанне і вывучаецца існуючая практыка адносна магчымасці выкарыстання і 18-месячнага цыкла міжрамонтнай эксплуатацыі і работы блокаў, — заўважыў міністр.

## «ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ» КААПЕРАТЫВЫ

Попыт на электраэнергію ў краіне рэальным сектарам эканомікі і насельніцтвам павялічваецца (сёлета агульны аб'ём яе спажывання дасягнуў за няпоўны год ужо 37,1 млрд кВт·г электрычнасці). А з моманту прыняцця на ўзроўні кіраўніка дзяржавы стымуляцыйных тарыфаў (з 2019 года) энергетыкам паступіла 101,8 тысячы зваротаў, з якіх задаволена 90,2 тысячы (88,6 %). Пры гэтым працэнт задавальнення зваротаў грамадзян штогод павялічваецца, заўважыў міністр:

— На 2021—2025 гады сфарміраваны перспектыўныя планы мадэрнізацыі электрасетак, якія ахопліваюць больш за 5,7 тысячы кіламетраў электрасетак і звыш 1500 населеных пунктаў, дзе будзе магчыма наладзіць выкарыстанне электрычнасці для падагрэву вады і ацяплення. Беларусы могуць таксама ствараць кааператыў і забяспечыць населены пункт электраэнергіяй на падагрэў вады і ацяпленне. Такая магчымасць даступная праз адміністрацыйную працэдуру або ў рамках Указа Прэзідэнта № 381 (дзеянне якога распаўсюджваецца на населеныя пункты, дзе

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




электрасеткі не замартызаваныя).

Жыхары могуць правесці мадэрнізацыю электрасетак, аплаціўшы 30 % яе кошту (70 % на работу патрацяць энергазабеспячальныя арганізацыі ці бюджэт у рамках праграмы «Камфортнае жыллё»). Ёсць нават прыклады, дзе такая работа ўжо праведзеная, удакладніў кіраўнік энергетычнага ведамства.

Згодна з праграмамі ўрада, у наступным пяцігоддзі не менш за палову жылля, якое будуецца, павінна быць «электрычным», таму колькасць такіх дамоў у шматкватэрным жылым сектары расце, заўважыў **Павел ДРОЗД, генеральны дырэктар аб'яднання «Белэнерга»:**

— Будаўніцтва электрадамоў запланавана найперш там, дзе адсутнічае інфраструктура, а не там, дзе пракладзены цеплассеткі. Эканамічныя разлікі паказваюць, што гэта больш мэтазгодна і па сродках, і па выкананні задачы павышэння электраспажывання ў краіне. А будаўніцтва электрадамоў у прыватным сектары скіравана найперш на паляпшэнне ўмоў жыцця людзей. Сённяшняя тарыфная палітыка таксама спрыяе гэтаму.

## ДЛЯ ПАСАЖЫРАЎ І ЎЛАДАЛЬНІКАЎ

Электраэнергія ў Беларусі выкарыстоўваецца і ў іншых сферах. Цяпер праходзяць два пілотныя праекты (у Шклове і Жодзіне) па пераводзе грамадскага транспарту на электробусы, расказаў міністр:

— У Жодзіне ўжо завершаны ўсе работы па знешнім энергазабеспячэнні, якое дазваляе падключыць зарадныя прылады для наступнага выкарыстання пры зарадцы электробусаў. У Шклове гэтая работа знаходзіцца на завяршальнай стадыі. Сёлета пасажыры ўжо змогуць скарыстацца на грамадскіх маршрутах новым відам транспарту і ацаніць, наколькі гэта зручна і экалагічна.

Пашыраецца і сетка зарадных станцый (згодна з праграмай да 2025 года), якія энергетыкі забяспечваюць электраэнергіяй. У краіне ўжо дзейнічае каля 700 станцый пад брэндам Malanka.

— Сёння мы бачым, што цікавасць да такіх станцый узрастае, а праекты ў Шклове і Жодзіне яшчэ больш павялічаць колькасць зарадных станцый, сёлета падобны праект плануецца рэалізаваць у Наваполацку, — пацвердзіў Павел Дрозд. — У сталіцы шмат станцый размешчана каля гандлёвых цэнтраў, вялікіх гасцініц, і гэта зручна для людзей і цяпер, і на будучыню, калі электракараў стане больш, каб можна было камфортна зараджацца.

Яшчэ адна магчымасць выкарыстання электраэнергіі — датацэнтрамі для майнінгу. І асобныя праекты, якія робяць унёсак у павелічэнне энергаспажывання, ужо ёсць. Гэткая ж цікавасць праяўляецца і на будаўніцтва такіх аб'ектаў у далейшым, дадаў Віктар Каранкевіч.

## «ПРЫВАТНЫЯ» ЭЛЕКТРАСЛУПЫ

Указам Прэзідэнта № 155 «Аб садаводчых таварыствах» мяркуецца вырашыць праблемныя пытанні, якія існуюць у гэтых суполках. У прыватнасці, дакумент дае магчымасць перадаваць на баланс дзяржаўных энергазабяспечвальных арганізацый высакавольтныя электрасеткі таварыстваў па фактычным стане незалежна ад тэрміну іх уводу ў эксплуатацыю, а таксама ўнутраныя сеткі з наступным заключэннем прамых дагавораў электразабеспячэння з грамадзянамі — членамі таварыстваў. Унутраныя сеткі пры гэтым павінны мець тэхнічна спраўны стан, а дачнікі — вынасныя прылады ўліку расходу электраэнергіі.



— Перадача электрасетак на баланс дзяржавы скіравана на карысць людзей, — заўважыў Павел Дрозд. — У кожным раёне створаны групы з прадстаўнікоў арганізацый электрасетак, якія разам з кіраўнікамі садаводчых таварыстваў (СТ) выязджаюць на абследаванне электрасетак і тлумачаць, што неабходна зрабіць, каб прыняць сеткі на баланс. Згодна з указам, сёння мы прымаем на баланс сеткі напружаннем 10 кВ у фактычным стане, а 0,4 кВ — у выніку абследавання і жадання ўсіх, хто пражывае ў СТ, перадаць гэтыя сеткі на наш баланс. Мы раздалі памяткі, каб усе ведалі, што неабходна зрабіць, каб энергасістэма прыняла іх на баланс.

Энергетыкі разумеюць усе пытанні, якія з'явяцца, калі электрасеткі СТ будуць пераведзены на баланс энергазабяспечвальных арганізацый, і што трэба будзе рабіць, каб прывесці сеткі ў адпаведны стан. А калі ў СТ таксама з'явіцца магчымасць рабіць у дамах сістэму электраацяплення, то павелічэнне электраспажывання ў краіне яшчэ больш павялічыцца. Тым не менш пакуль вялікай колькасці ахвотных не назіраецца, удакладніў спікер:

— Указ уступіў у сілу 2 снежня, і ўсе ўжо раз'ехаліся з садаводчых таварыстваў на зіму. Таму будзем чакаць 2024 года, каб пабачыць працэнт зваротаў і тэндэнцыю таго, што адбываецца.

Энергасістэма гатовая, каб забраць на баланс усе сеткі 10 кВ. Электрасеткі напружаннем 0,4 кВ — пасля рэканструкцыі адпаведна з патрабаваннямі нарматыўных дакументаў, якую за свой кошт павінны выканаць члены СТ, падкрэсліў гендырэктар «Белэнерга»:

— Праблема ў тым, што некаторыя апоры лініі электраперадачы знаходзяцца на прыватным участку грамадзяніна, і энергетыкі не могуць іх абслугоўваць. Гэта здарылася ў выніку таго, што ў свой час садовыя таварыствы пашыралі свае ўчасткі, і апоры, якія знаходзіліся ўздоўж вуліцы і былі на мяжы садовага ўчастка, апынуліся ў агародах людзей. Спадзяёмся, што ўказ дапаможа вырашыць гэтыя пытанні.

## 100 ГАДОЎ ДЛЯ ЯДЗЕРНЫХ АДХОДАЎ

Пытаннямі фарміравання сістэмы доўгатэрміновага захоўвання і захавання радыеактыўных адходаў займаецца кампанія, створаная ў лютым 2023-га, — Беларуская арганізацыя па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі (РАА). Пад імі маюцца на ўвазе ўсе радыеактыўныя адходы, якія ўвогуле ўтвараюцца ў краіне. Хоць адходы ад БелАЭС будуць складаць да 95 % (180 м³ эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў) ад агульнай масы, гэткія ж небяспечныя адходы ўтвараюцца і ў іншых галінах. Гэта ядзерная медыцына, сельская гаспадарка, прамысловасць — усе сферы, дзе выкарыстоўваюцца крыніцы іанізацыйнага выпраменьвання.

— Рэспубліканскі пункт захоўвання і захавання радыеактыўных адходаў дасць магчымасць збору, перапрацоўкі, кандыцыянавання, захоўвання і захавання ўсіх РАА, якія ствараюцца ў Беларусі, — расказаў міністр. — Вядзецца работа па выбары пляцоўкі (ідуць дадатковыя вышукальныя работы), па вывучэнні абсталявання і тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца ў розных краінах. У далейшым паўстануць пытанні перадпраектнай, праектнай дакументацыі, будаўніцтва і ўводу аб'екта ў эксплуатацыю. Калі будуць прапанаваны розныя варыянты па пляцоўках, яшчэ правядзём грамадскія слуханні і абмеркаванні як унутры краіны, так і па-за яе межамі.

Адпрацаванае ядзернае паліва, частку якога нядаўна замянілі падчас чарговага планава-папераджальнага рамонту, цяпер фарміруецца ў басейнах вытрымкі. Цягам васьмі-дзесяці гадоў такое паліва ў цеплавыдзяляльных зборках будзе знаходзіцца непасрэдна на станцыі з мэтай паніжэння рэшткавага цеплавыдзялення і радыеактыўнасці. Пасля ў спецыяльных транспартна-ўпаковачных кантэйнерах (ТУКах) яго накіруюць на заводы ў Расію на перапрацоўку. Назад у Беларусь будзе вяртацца эквівалент — гэткая шкламатрыца ў кантэйнерах (пасля 2050 года). Усе пытанні будуць вызначацца індывідуальна на кожнай партыі, якая будзе адпраўляцца ў Расію на перапрацоўку, падкрэсліў Віктар Каранкевіч.

## РЫХТАВАЦЦА ДА ЗАДАВАЛЬНЕННЯ ЭЛЕКТРАПАТРЭБ

Энергасістэма адсочвае, каб усе аб'екты генерацыі энергіі ў краіне працавалі эфектыўна і надзейна, а крыніцы — гарманічна, дапаўняючы адна адну, выконваючы асноўную задачу па надзейнасці. Энергетыкі разглядаюць розныя пытанні (арганізацыйныя, тэхнічныя, эканамічныя), якія звязаны не толькі з будаўніцтвам, але з магчымасцю далейшай эксплуатацыі АЭС.

— У поўным складзе работы абсталявання на БелАЭС аб'ект здольны закрыць да 40 % унутраных патрэб Беларусі ў электраэнергіі (але гэта з улікам існуючых параметраў і аб'ёмаў спажывання). Аднак праводзяцца мерапрыемствы па павелічэнні выкарыстання электраэнергіі ў краіне, таму трэба аналізаваць ужо не 2030—2035 гады, а 2040-ы, — паведаміў міністр.

У далейшым у краіне працягне развівацца прамысловасць, электратранспарт, адпаведна, будуць мяняцца аб'ёмы спажывання электраэнергіі. Калі хаця б 30—40 % аўтапарка пяройдзе на электрацягу. Працягнецца і пераход на электрычнасць жылля (у гэтай і наступнай пяцігодцы), будаўніцтва новага электрыфікаванага жылля, прамысловых аб'ектаў — усё гэта дадасць сур'ёзны аб'ём спажывання электраэнергіі. Да 2025 года ў планах энергетыкаў — вывесці электраспажыванне на ўзровень 44 млрд кВт·г, а да 2030-га — 47 млрд кВт·г, і сістэма павінна быць гатовая задаволіць гэтыя патрэбы. З гэтай нагоды прапрацоўваецца пытанне магчымага будаўніцтва ў Беларусі другой АЭС ці трэцяга энергаблока, а таксама размяшчэння пляцовак для іх.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# ПАТРЫЁТЫ З ПОЛАЦКАЙ ПРАПІСКАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Ля вытокаў стварэння Полацкага кадэцкага вучылішча стаяў **палкоўнік Узброеных Сіл, былы камандзір 377-га гвардзейскага зенітнага ракетнага палка Станіслаў КРАСОЎСКІ,** які ўзначальваў Камітэт па адраджэнні Полацкага кадэцкага корпуса. На працягу апошніх шасці гадоў афіцэр кіруе навучальнай установай.

І першае пытанне дырэктару Полацкага кадэцкага вучылішча — як даведаліся аб тым, што калектыў стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне»?

— Гэтую радасную навіну мне паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама, — узгадвае Станіслаў Красоўскі. — Вядома, гэта было нечакана. Адразу падзяліўся гэтай інфармацыяй з калегамі. Усе прыйшлі да высновы: добра атрымаць такую высокую ўзнагароду, але яна шмат да чаго і абавязвае. З'явілася павышанае пачуццё адказнасці.

Гэтага акурат як у супрацоўнікаў, так і ў выхаванцаў вучылішча не займаць. Такая якасць, як адказнасць, уласцівая і кіраўніку навучальнай установы. Яшчэ адраджаючы Полацкі кадэцкі корпус, разам з аднадумцамі ён паставіў тры надзвычай адказныя задачы: адчыніць вучылішча, вярнуць сцяг Полацкага кадэцкага корпуса, які знаходзіўся ў Нью-Ёрку, і стварыць музей праслаўленай навучальнай установы. Амбіцыйна, але рэальна. Полацкае кадэцкае вучылішча ўжо выпусціла каля 700 выхаванцаў, сцяг вярнуўся на гістарычную Радзіму, а музей Полацкага кадэцкага корпуса прымае наведвальнікаў. Аднак аб усім па парадку.



Гісторыя Полацкага кадэцкага вучылішча пачалася ў 2006 годзе са стварэння кадэцкага класа на базе сярэдняй школы. Цяпер гэта паўнавартасная навучальная ўстанова са шматлікімі сучаснымі карпусамі, у якіх дзеці вучацца, займаюцца фізічнай культурай, ваеннай падрыхтоўкай, творчасцю, ядуць і адпачываюць.

Немалых намаганняў удалося прыкласці, каб вярнуць сцяг Полацкага кадэцкага корпуса з Нью-Ёрка. Як ён туды трапіў, можна напісаць цэлую аповесць. Калі коратка, то ў пачатку Першай сусветнай вайны Полацкі кадэцкі корпус быў эвакуяваны ў Палтаву. Падчас Грамадзянскай вайны злучэнне апынулася ў Сібіры. Як вядома, бальшавікі знішчалі царскую сімволіку. Такі лёс чакаў і сцяг Полацкага кадэцкага корпуса, а таксама Сібірскага і Сумскога карпусоў. Але кадэты адцягнулі ўвагу часавых і вынеслі ўсе тры сцягі. У выніку іх не знайшлі, але адважных хлопцаў за гэты ўчынак чакала смяротнае пакаранне. Сцягі былі дастаўлены ў Крым, адтуль — у Сербію. Там і захоўваліся доўгі час. Па загадзе сербскага караля, які меў кадэцкае мінулае, сцяг Полацкага кадэцкага корпуса стаў яшчэ і сцягам зводнага Рускага кадэцкага корпуса. У 1944 годзе корпус быў распушчаны, а кадэты раз'ехаліся па ўсім свеце. Так сцягі апынуліся ў ЗША. Доўгі час яны захоўваліся ў праваслаўным саборы Нью-Ёрка. У выніку працяглай перапіскі ўплывовых сватароў Беларусі, у тым ліку мітрапаліта Філарэта, прадстаўнікоў Саюза суворараўцаў і кадэтаў з нашчадкамі тых кадэтаў сцяг Полацкага кадэцкага корпуса вярнуўся на Радзіму. У наступным годзе рэліквіі споўніцца 180 гадоў. У рэканструяваным выглядзе сцяг займае ганаровае месца ў музеі Полацкага кадэцкага корпуса — такім чынам, і трэцюю задачу ўдалося ажыццявіць.

## Высокі конкурс і адбор сапраўдных

Нягледзячы на тое, што ў кожным рэгіёне краіны ёсць сваё кадэцкае вучылішча, у Полацку вучацца хлопцы і дзяўчаты з усёй Беларусі — усяго 275 чалавек. У наступным годзе планецца, што іх будзе тры сотні — у выніку навучальная ўстанова стане лідарам сярод кадэцкіх вучылішчаў па колькасці навучэнцаў. Каб паступіць у навучальную ўстанову, неабходна здаць іспыты па матэматыцы і мове (рускай або беларускай). Акрамя таго, правяраецца фізічная і псіхалагічная падрыхтоўка кандыдата ў кадэты.

У вучылішчы вучацца на працягу чатырох гадоў. Паступаюць сюды пасля сёмага класа. Жадаючых стаць кадэтамі заўсёды шмат. І калі хлопцам прасцей, то дзяўчатам, каб адзець кадэцкія пагоны, трэба моцна пастарацца. У кожным узводзе (класе) вучыцца па 25 чалавек, з іх — толькі шэсць дзяўчат.

«Прызначэнне кадэцкіх вучылішчаў — падрыхтоўка да паступлення ў ваенныя навучальныя ўстановы сістэмы нацыянальнай бяспекі, — тлумачыць Станіслаў Красоўскі. — На жаль, там вучыцца абмежаваная колькасць дзяўчат. Таму тая лічба дзяўчат, якую мы набіраем, дазваляе ім потым паступаць у ваенныя ВНУ і ў далейшым працаўладкоўвацца».

Напрыклад, калі палачанка Карына Сухава паступала ў вучылішча, конкурс складаў 17 чалавек на месца. Можна толькі ўявіць пачуцці дзяўчыны, калі яна папоўніла кадэцкія шэрагі! «Колькі сябе памятаю, мне падабалася ваенная форма, — расказвае **выхаванка 3-га ўзвода 2-й роты (10 клас) Карына СУХАВА.** — Таксама любіла ўдзельнічаць у ваенна-спартыўнай гульні «Зарніца», таму мой выбар быў навідавоку. Яшчэ і бацька служыць ва ўнутраных войсках».

Карына — алімпіядніца па фізіцы і матэматыцы, ідзе на залаты медаль. Паколькі дзяўчына добра вучыцца і з дысцыплінай усё ў парадку, то кожныя выхадныя яна дома. Плануе паступаць у Ваенную акадэмію, на факультэт ваеннай разведкі. Лічыць, што такая спецыяльнасць па сілах і жанчынам.

Дарэчы, Полацкае кадэцкае вучылішча з'яўляецца адным з лідараў па паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы сілавога блока. Курсантамі не становяцца, як правіла, тыя, у каго ўзніклі праблемы са здароўем.

«Кадэцкае вучылішча і прызначана акурат для таго, каб падбіраць будучых абаронцаў Айчыны, — звяртае ўвагу дырэктар навучальнай установы. — Адных накіроўваюць бацькі: хочуць, каб у вучылішчы іх дзяцей перавыхавалі. Іншых прываблівае прыгожая форма, а калі пачынаюць вучыцца, бачаць, што гэта не тое, чым бы яны хацелі займацца. Некаторым мы самі рэкамендуем пакінуць сцены ўстановы: бачым, што па пэўных маральна-дзелавых якасцях гэтым людзям нельга даверыць у будучыні ні зброю, ні асабовы састаў. Таму адна з задач кадэцкага вучылішча — адабраць сапраўдных патрыётаў Радзімы — у поўнай меры ажыццяўляецца».

## Трапныя стралкі і адказныя пошукавікі

Навучальная ўстанова становіцца домам для хлопцаў і дзяўчат. Для кагосьці — адзіным. Тут вучыцца нямала дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У некаторых увогуле іх няма. Дзяржава бярэ на сябе клопат аб дзецях, пазбаўленых бацькоўскай любові, і прадастаўляе ім магчымасць паступіць у вучылішча па-за конкурсам. Усе выхаванцы знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні: іх тут адзяваюць, кормяць, дбаюць пра іх фізічнае і духоўнае развіццё. Для гэтага створаны ўсе ўмовы.

Што датычыцца навучальнай праграмы, ад звычайных школьнікаў кадэты адрозніваюцца тым, што ім не выкладаецца прадмет «Праца». Затое дапрызыўную падрыхтоўку яны спасцігаюць на працягу ўсяго перыяду навучання — пачынаючы з 8 класа, а не з 10-га, як у звычайнай школе. На базе вучылішча дзейнічае Цэнтр ваеннай падрыхтоўкі з унікальнай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Напрыклад, дзякуючы тактыка-стралковаму трэнажору «Профі-4», хлопцы і дзяўчаты становяцца трапнымі стралкамі. Падобных трэнажораў у краіне больш нідзе няма, а таму супрацоўнікі спецпадраздзяленняў па-добраму зайздросцяць полацкім кадэтам.

Акрамя таго, ваенная падрыхтоўка ўключае ў сябе вывучэнне зброі, якая знаходзіцца на ўзбраенні беларускай арміі, палажэнняў Устава, страявую і ваенна-медыцынскую падрыхтоўку. З выхаванцамі працуюць вопытныя педагогі з 25-гадовым стажам службы ў арміі. У кожнага з іх — найбагацейшы вопыт, у тым ліку баявы. Напрыклад, да прыкладу, **кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні, выкладчыка дапрызыўнай падрыхтоўкі падпалкоўніка Роберта ІСМАЙЛАВА** — 35 гадоў воінскай службы! Служыў у 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі (цяпер асобная гвардзейская паветрана-дэсантная брыгада), быў камандзірам ВПС і войск СПА. Асаблівая старонка ў яго біяграфіі — удзел у баявых дзеяннях у Афганістане, куды лятаў двойчы. Пра свае подзвігі расказвае сціпла: маўляў, многія так рабілі. Магчыма, але не ў многіх на грудзях — ордэн Чырвонай Зоркі і два медалі «За адвагу».

Роберт Ісмайлаў прызнаецца, што камандаваць дзецьмі складаней, чым афіцэрамі і салдатамі. «Пераключыцца з дарослых людзей на кадэтаў было няпроста, нават звышскладана, і гэта нягледзячы на педагагічную адукацыю, — заўважае ён. — Але ў нас вучацца дзеці, якія паставілі перад сабой мэту — стаць афіцэрамі, таму іх матывацыя дапамагае нам, дарослым. Па-другое, мы паказваем выхаванцам, што патрыятызм — не пустое слова. У вучылішчы створаны патрыятычны атрад «Полацкі кадэт» з 30 чалавек. За паўтара года работы разам з ваеннаслужачымі мы падня лі 229 астанкаў загінулых воінаў Чырвонай Арміі. Ажыццяўляем па 5-6 экспедыцый у год. Артэфактамі, знойдзенымі падчас раскопак, папаўняем музейную экспазіцыю. Некаторыя лічаць, што непажадана дзецям глядзець на астанкі загінулых. У нас іншае меркаванне: калі кадэты бачаць усё на свае вочы, яны разумеюць, што такое вайна і чаму яе нельга дапусціць».



## Традыцыйныя паездкі і любімае месца

Калектыў вучылішча — гэта паўсотня высакакласных спецыялістаў. Агульнаадукацыйныя прадметы выкладаюць цывільныя настаўнікі (практычна ўсе з іх — з вышэйшай катэгорыяй). «Ад звычайнай школы мы адрозніваемся і тым, што нашы дзеці знаходзяцца ў вучылішчы кругласутачна: з панядзелка па першую палову суботы, — кажа **намеснік дырэктара Полацкага кадэцкага вучылішча па вучэбнай рабоце Святлана ФІЛІМОНАВА.** — У першай палове дня для іх выкладаюцца агульнаадукацыйныя прадметы, другая палова — час для рэалізацыі профільнай падрыхтоўкі. У кадэтаў занятая кожная хвіліна».

Хлопцы і дзяўчаты з задавальненнем займаюцца ў трэнажорнай зале, гуляюць у валейбол, баскетбол і іншыя гульні. У перапынку паміж урокамі спаборнічаюць у настольным тэнісе. У харэаграфічнай зале кадэты вучацца танцаваць вальс і іншыя танцы: яны актыўныя ўдзельнікі прэзідэнцкага і абласнога балаў. Нядаўна вярнуліся з Міжнароднага дабрачыннага кадэцкага бала, які праходзіў у Маскве. У вучылішчы створаны танцавальны калектыў «Полацкія кадэты», арганізавана інструментальная група.

Выхаванцы ўдзельнічаюць ва ўсіх патрыятычных акцыях горада, краіны. У вучылішчы ёсць добрая традыцыя: штогод усім саставам яны наведваюць знакавыя месцы Беларусі. Летась, напрыклад, на цягніку ездзілі ў Брэсцкую крэпасць. Двойчы былі ў Хатыні, наведвалі Лінію Сталіна. Вясной у кадэтаў і выкладчыкаў запланавана паездка ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Любімае месца хлопцаў і дзяўчат — сталовая. Харчаванне збалансаванае, пяціразовае. Карэспандэнты прадэгуставалі — смачна, як дома. **Выхаванец 2-га ўзвода 1-й роты (8 клас) Максім ФЯКЛІСАЎ** кажа, што з пачатку навучальнага года набраў пяць кілаграмаў. «Усяго хапае, часам нават зашмат», — прызнаецца хлопчык. Максім родам з Наваполацка. Паступаць у кадэцкае вучылішча яму прапанавала мама. «Мне тут вельмі падабаецца, — дадае ён. — Вучыцца нескладана. Выкладчыкі, афіцэры-выхавацелі строгія, але справядлівыя». Выхаванец марыць стаць міліцыянерам або ваеннаслужачым. Дарэчы, выпускнікі кадэцкіх вучылішчаў паступаюць у ваенныя ВНУ па-за конкурсам. Пры ўмове, што ў атэстаце павінны быць адзнакі не ніжэй чым «сем».

**Аляксандр БАГАМОЛАЎ, выхаванец 2-га ўзвода 4-й роты (11 клас),** з дзяцінства марыць стаць ваеннаслужачым, гэтым самым працягнуць афіцэрскую дынастыю. Бацька хлопца заканчваў службу ў 103-й Віцебскай асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгадзе. Пагоны ў свой час насіў і дзядуля. Малады чалавек плануе паступаць у Інстытут пагранічнай службы. За гады навучання ў вучылішчы Саша вызначыўся ў спорце. Ён — прызёр раённага і абласнога этапаў рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Фізічная культура», найлепшы спартсмен Полацка 2022 года.

...Яны прыходзяць у вучылішча зусім юныя, але з вялікай марай аб кадэцкай будучыні. Несамастойныя, у нейкім сэнсе легкадумныя, за гады, праведзеныя ў гэтых сценах, становяцца абсалютна падрыхтаванымі да дарослага жыцця — з птушанят пераўтвараюцца ў прыгожых птушак, якія з усёй адказнасцю абіраюць свой далейшы шлях. Ужо будучы ў курсанцкіх радах, яны вызначаюцца сваёй выпраўкай, дысцыплінаванасцю і падрыхтоўкай — адным словам, сапраўдныя патрыёты. З полацкай прапіскай.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**
*г. Полацк.*

# «НАШЫ СТУДЭНТЫ ВЕДАЮЦЬ, ШТО ТАКОЕ

**Увага з боку дзяржавы да аграпрамысловага комплексу заўсёды была і будзе звышпільнай. Інакш нельга — гэта і харчовая бяспека краіны, і мільярдны экспарт прадукцыі сельскай гаспадаркі. Галіна сапраўды стратэгічная, і тым больш важна, каб працавалі ў ёй прафесіяналы, спецыялісты найвышэйшага класа, не на словах, а на справе адданыя працы на зямлі. Аб тым, як падрыхтаваць такіх спецыялістаў і чаму выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта называюць «універсальнымі салдатамі», спыталіся ў рэктара навучальнай установы Мікалая РАМАНЮКА.**



## Пра ўніверсітэт

***— Мікалай Мікалаевіч, споўнілася 35 гадоў, як вы ўпершыню адчынілі дзверы БДАТУ, тагачаснага БІМСГ. Для вас ён — сапраўдная альма-матар, месца вучобы і адзінае месца працы. Дык што такое БДАТУ вачыма студэнта, інжынера, навуковага супрацоўніка, выкладчыка, рэктара?..***

— На кожнай ступені «вочы» розныя былі, і погляд, адпаведна, розны. Але заўсёды нязменным заставалася адно — прафесіяналізм. Як прынцып дзейнасці ўніверсітэта. Маю на ўвазе прафесіяналізм выкладчыкаў, навукоўцаў, выпускнікоў. Менавіта гэта, прафесіянальнае стаўленне да работы і вучобы, упэўнены, дазволіла БДАТУ стаць адным з вядучых у Беларусі навучальных і навукова-вытворчых цэнтраў. На пяці факультэтах рыхтуюць канкурэнтаздольныя інжынерныя і эканамічныя кадры для айчыннага аграпрамысловага комплексу, а таксама для сельскагаспадарчых галін іншых краін. Моцны прафесарска-выкладчыцкі састаў, выдатная, без перабольшвання, матэрыяльна-тэхнічная база, у стварэнні і ўтрыманні якой, дарэчы, значна дапамагае роднае міністэрства, прафсаюз работнікаў АПК і яго старшыня Васіль Міхайлавіч Хвацік асабіста, грунтоўныя навуковыя даследаванні — вось тры кіты, на якіх трымаецца высокі ўзровень нашага ўніверсітэта.

Кожны з гэтых складнікаў падпарадкаваны адной мэце — падрыхтаваць адукаванага, высокакваліфікаванага і запатрабаванага спецыяліста. Ведаеце, кожная навучальная ўстанова мае свае традыцыі, свае нейкія няпісаныя законы. Яны бываюць розныя, некаторыя прыдуманыя — я ў добрым сэнсе кажу, а некаторыя выпрацоўваюцца самі сабою, з цягам часу, яны часцей за ўсё невідавочныя, нідзе не дэкларуюцца і на паперы не прапісаны. Але менавіта яны складаюць тое, што можна назваць сутнасцю, душою ўніверсітэта. У нас таксама ёсць такая традыцыя, і фармулюецца яна надзвычай проста: «Вучыць так, каб не сорамна было за выпускнікоў». Таму да прынцыпу прафесіяналізму дадам яшчэ адзін — прынцып якаснай падрыхтоўкі.

***— Па якіх спецыяльнасцях рыхтуюць студэнтаў у БДАТУ? Улічваючы аграрную спецыялізацыю, напэўна сярод іх ёсць і ўнікальныя, якіх больш нідзе не атрымаеш?***

— Мы рыхтуем спецыялістаў па 11 спецыяльнасцях: 9 інжынерных і 2 эканамічныя. На аграэнергетычным факультэце, між іншым, адзіным у краіне, на якім рыхтуюць кадры для энергетыкі АПК, выпускнікі атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасцях «Энергетычнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі» і «Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцяў». Факультэт «Тэхнічны сэрвіс у АПК» забяспечвае падрыхтоўку інжынераў для сэрвісу сельскагаспадарчай тэхнікі і ў галіне аховы працы. Па апошняй спецыяльнасці, дарэчы, толькі ў нашым універсітэце можна атрымаць адукацыю на ўсіх ступенях вышэйшай адукацыі, па перападрыхтоўцы і ў аспірантуры. На аграмеханічным факультэце студэнты навучаюцца па спецыяльнасцях «Тэхнічнае забеспячэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі» і «Тэхнічнае забеспячэнне захоўвання і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі», а на факультэце прадпрымальніцтва і кіравання вядзецца падрыхтоўка па спецыяльнасцях «Аграбізнес» і «Менеджмент».

Асобна зазначу тое, што нашы выпускнікі, нягледзячы на «аграрны» статус універсітэта, запатрабаваны не толькі ў арганізацыях аграпрамысловага комплексу. Дзякуючы высокаму ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі і шырокім практычным навыкам яны могуць працаваць практычна ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, у тым ліку і вузкаспецыялізаваных.

## Пра тэхналогіі навучання

***— Гэта вялікі плюс. Дарэчы, пра іншыя галіны: сёння работадаўцы ўсё больш зацікаўлены ў спецыялістах, якія маюць веды і навыкі на стыку сфер. Вашы выпускнікі валодаюць такімі? І якой увогуле вам бачыцца будучыня міждысцыплінарнай адукацыі і ці ёсць яна, гэтая будучыня?***

— У дачыненні да нашых выпускнікоў заўважу, што адукацыйныя праграмы падрыхтоўкі па інжынерных спецыяльнасцях змяшчаюць шырокі спектр прафесійных кампетэнцый не толькі ўласна інжынера, але і тэхнолага, і арганізатара вытворчасці... Падчас навучання, падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ, вытворчай практыкі студэнты авалодваюць масай сумежных спецыяльнасцяў. Проста гэта не ўпісана ў дыплом, а на справе нашы інжынеры без асаблівых цяжкасцяў могуць быць, напрыклад праекціроўшчыкамі. Іх заўсёды чакаюць на прадпрыемствах прамысловасці, машынабудавання, энергетычнага комплексу. Гэта не пустыя словы — дастаткова толькі паглядзець кадравы састаў хоць бы кіруючых работнікаў тых галін, і вы здзівіцеся таму, колькі сярод іх нашых выпускнікоў. Мы сапраўды рыхтуем «універсальных салдатаў», калі можна так сказаць.

Што да міждысцыплінарнай адукацыі, то будучыня ў яе, канешне, ёсць. Больш за тое, асмелюся дапусціць, што яна можа стаць асновай прафесійнай адукацыі. Многія праблемы патрабуюць комплекснага падыходу, а значыць, узаемадзеяння і ўзаемапранікнення розных галін ведаў. Таму лагічна, што міждысцыплінарнае навучанне будзе набываць усё большую папулярнасць. Ужо сёння яно найбольш набліжана да сучасных запытаў эканомікі прадпрыемстваў. Самы просты прыклад з таго, што згадвалі раней: навошта трымаць асобна інжынера і праекціроўшчыка, калі гэта можа рабіць адзін чалавек?

Наша асяроддзе мяняецца і патрабуе ад студэнтаў не толькі спецыялізаваных ведаў, але і здольнасцяў да аналізу, сінтэзу і вырашэння складаных міждысцыплінарных задач.

***— Калі ўжо размова скіравалася на тэхналогіі навучання, то варта згадаць і практыка-арыентаванае, якое таксама на слыху. Як спалучаюцца тэорыя і практыка ва ўніверсітэце? І як вы асабіста ставіцеся да тэзіса, што выкладаць пэўныя дысцыпліны павінны толькі спецыялісты-практыкі?***

— Перш-наперш адзначу, што практыка-арыентаванае навучанне — гэта не толькі арганізацыя навучальных, вытворчых і пераддыпломных практык. Гэта, акрамя таго, яшчэ і ўкараненне прафесійна-арыентаваных тэхналогій навучання, якія сфарміруюць у студэнтаў значныя для будучай прафесійнай дзейнасці якасці, веды, уменні і навыкі, прафесійны вопыт. Прасцей кажучы — усё тое, што дазволіць ім якасна выконваць свае абавязкі падчас працы. Уся справа ў тым, што практыка-арыентаванае навучанне як працэс немагчыма рэалізаваць выключна ў рамках рознага кшталту вытворчых практык. Каб дасягнуць максімальнага эфекту, трэба таксама пастаянна ўдасканальваць вучэбна-праграмную базу, што мы і робім.

Калі казаць больш канкрэтна, то ў нас агульная працягласць вытворчай практыкі ў залежнасці ад спецыяльнасці складае ад 28 да 30 тыдняў і праходзіць у тры этапы. Для праходжання вучэбнай практыкі на першым этапе ва ўніверсітэце створаны Рэспубліканскі вучэбна-вытворчы цэнтр практычнага навучання новым тэхналогіям і асваенню комплексаў машын, дзейнічаюць шэсць спецыялізаваных майстэрняў, адзін вучэбна-даследчы корпус і тры вучэбна-вытворчыя цэнтры ў Мінскай вобласці — у агракамбінатах «Дзяржынскі», «Ждановічы» і «Сноў». Тут студэнты набываюць рабочыя прафесіі: слесара, вадзіцеля, трактарыста. То-бок акрамя атрымання спецыяльнасці, яны яшчэ і авалодваюць прафесійнымі навыкамі сваіх будучых падначаленых, што, безумоўна, прынясе ім карысць у будучыні.

Але ж вернемся да практыкі. Другі яе этап — у базавых арганізацыях: на машынабудаўнічых прадпрыемствах — МАЗ, МТЗ, «Амкадор» і іншых, а таксама ў 36 філіялах універсітэцкіх кафедраў, якія дзейнічаюць у вядучых прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу і навукова-практычных цэнтрах НАН Беларусі. Акрамя таго, разам з Мінсельгасхарчам і камітэтамі па сельскай гаспадарцы аблвыканкамаў вызначылі 283 базавыя сельгасарганізацыі па ўсёй краіне, ад адной да трох у кожным раёне, для праходжання вытворчых практык студэнтаў-мэтавікоў. Такім чынам, пасля заканчэння ўніверсітэта яны прыйдуць ва ўжо знаёмы калектыў. Для гаспадарак таксама ёсць свая выгада — кіраўніцтва загадзя можа ацаніць патэнцыял будучага маладога спецыяліста.

Трэці этап практычнай падрыхтоўкі, пераддыпломная практыка, уяўляе сабою работу дублёрам асноўнага работніка. Звычайна яна праходзіць па месцы размеркавання выпускнікоў. Самі ж дыпломныя работы выконваюцца з улікам рэальных праблем менавіта гэтага прадпрыемства, што, з аднаго боку, максімальна скіроўвае «дыплом» у практычнае рэчышча, а з іншага — значна скарачае адаптацыйны перыяд маладых спецыялістаў: яны ўжо ведаюць агульны стан спраў у гаспадарцы, яе моцныя і слабыя бакі.

Такім чынам, мы максімальна набліжаем студэнтаў да рэчаіснасці, яны пастаянна звязаны з вытворчасцю. Гэта яшчэ акрамя таго, што ў нашых вучэбна-вытворчых базах, дзе прадстаўлены абсалютна ўвесь парк сельскагаспадарчай тэхнікі, якая атрымала дазвол да эксплуатацыі ў краіне, яны пастаянна «працуюць рукамі». Асобна адзначу ролю філіялаў кафедраў. Іх стварэнне ў спалучэнні з вытворчай практыкай дазволіла нам выбудаваць стройную і эфектыўную сістэму практыка-арыентаванай падрыхтоўкі, змястоўна і якасна ўвязаць яе з сучасным узроўнем тэхнічнай аснашчанасці сельгасвытворчасці.

Што датычыцца таго, хто лепшы выкладчык — практык або тэарэтык, то скажу так: лепшы той, хто ўмее. Нельга ігнараваць факт, што не кожны спецыяліст-практык — добры выкладчык і педагог. Так бывае, і ў гэтым няма нічога такога звышнатуральнага і дзіўнага. Як і ў тым, што выдатны навуковец можа быць зусім не здольны да выкладчыцкай дзейнасці. Гэта нармальна. Сёння ў БДАТУ каля 40 % выкладчыкаў маюць досвед працы на вытворчасці — ад інжынераў да кіраўнікоў вышэйшага звяна. Акрамя таго, кожны з іх як мінімум раз на тры гады праходзіць павышэнне кваліфікацыі і стажыроўку на найлепшых прадпрыемствах краіны, навукова-даследчых інстытутах і навукова-практычных цэнтрах. Такім чынам, мы не даём ім адарвацца, так бы мовіць, ад рэальнасці і пераўтварыцца ў чыстай вады тэарэтыкаў.

## Пра кіраўнікоў і штучны інтэлект

***— А практыкам не даяце забыць тэорыю?***

— Безумоўна, свет сёння надзвычай хуткі, імклівы: ледзь не штодзённа мяняюцца і з'яўляюцца новыя тэхналогіі. Таму работнікам АПК, асабліва кіруючым, трэба быць у трэндах, арыентавацца ў тэндэнцыях развіцця галіны, умець прыстасоўвацца да новых умоў і вымушаць іх працаваць на сваю карысць.

У Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў АПК (ІПКіПК АПК) штогод удасканальваюць свае веды каля 3000 работнікаў галіны. З іх перападрыхтоўку праходзяць каля 400 чалавек, астатнія павышаюць кваліфікацыю і стажыруюцца на вядучых прадпрыемствах краіны. Відавочна, асаблівая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый, у тым ліку нядаўна назначаным, якія пакуль не маюць дастатковага практычнага вопыту, а бывае, што і ведаў па арганізацыі інавацыйнай сельскагаспадарчай вытворчасці. У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб практычным навучанні кандыдатаў на пасады кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый» у мінулым навучальным годзе праграму вывучэння новых метадаў, тэхналогій і элементаў прафесійнай дзейнасці паспяхова засвоілі 25 слухачоў, у 2021/2022 — 28.

Для паляпшэння якасці адукацыі і насычэння яе практычнымі складнікамі Інстытутам створаны два філіялы кафедры інавацыйнага развіцця аграпрамысловага комплексу ў буйных гаспадарках — ААТ «Астрамечава» і ТАА «Беларуськалій-Агра». Толькі ў гэтым навучальным годзе нашы выкладчыкі сумесна з мясцовымі кіраўнікамі і спецыялістамі правялі каля 300 выязных заняткаў у сельгасарганізацыях, навукова-практычных цэнтрах НАН Беларусі, на іншых інавацыйных вытворчых пляцоўках.

***— У працяг тэмы імклівага свету: ці паспяваюць навучальныя праграмы за сучаснымі тэхналогіямі?***

— З паскарэннем развіцця тэхналогій, вымушаны канстатаваць, павялічваецца і пагроза такога адставання. Трэба быць страусам з галавою ў пяску, каб не заўважаць гэтага. Мы заўважаем, таму ўсе навучальныя планы і праграмы пераглядаем і дапрацоўваем штогод, а бывае, што рэагуем і больш аператыўна. У цэлым, інавацыйныя тэхналогіі і лічбавыя інструменты выкладання, якія адпавядаюць сучасным падыходам да кіравання сельскагаспадарчымі працэсамі, — у нас звычайная справа.

Так, авалодваючы тэхналогіямі лічбавага земляробства, студэнты вывучаюць карціраванне контураў палёў, аналізуюць іх ураджайнасць і аграхімічны стан, сістэму апрацоўкі і дыферэнцыраванае ўнясенне ўгнаенняў. Для пабудовы тэматычных карт сельскагаспадарчых угоддзяў карыстаюцца інструментарыем ГІС-тэхналогій, а камп'ютарызаваныя лабараторныя стэнды дазваляюць аналізаваць атрыманыя даныя ў рэжыме рэальнага часу і праецыраваць іх на анлайн-картах. Ёсць у нас праграмна-апаратны комплекс віртуальнай рэальнасці, які імітуе зборку розных электрычных схем, шырока выкарыстоўваем 3D-друк. Увогуле, лічбавізацыя, выкарыстанне дронаў — гэта будучае сельскай гаспадаркі. Таму і мы не адстаём ад тэхналогій: адзін клас па лічбавай сельскай гаспадарцы ўжо гатовы, у хуткім часе пачне работу другі, у стварэнні якога супрацоўнічаем з «Рассельмашам», плюс да ўсяго плануем арганізаваць «разумную ферму».

Таксама студэнты вывучаюць магчымасці прымянення штучнага інтэлекту ў эканоміцы, такія, напрыклад, як кантроль бяспечнасці прадукцыі, статыстычныя алгарытмы для вызначэння верагоднасці будучых эканамічных вынікаў, ацэнку рызык і якасную праверку тавараў, знаёмяцца з элементамі машыннага навучання.

***— А не баіцеся, што хутка выкладчыкам давядзецца правяраць курсавыя і дыпломныя работы, напі-***

# ПРАЦА НА ЗЯМЛІ, І НЕ ЦУРАЮЦЦА ЯЕ»

***саныя «ChatGPT»? І ўвогуле, на вашу думку, як штучны інтэлект паўплывае на адукацыйныя працэсы?***

— Я думаю, што гэтыя асцярогі крыху перабольшаныя. Яны нагадваюць той час, калі пачаў шырока распаўсюджвацца інтэрнэт. Тады таксама баяліся, што студэнты масава, агулам будуць спампоўваць усе гатовыя работы і выдаваць за ўласныя. Але ж гэтага, як бачым, не адбылося. Не апошнюю ролю ў гэтым, між іншым, іграе і свядомасць маладых людзей. Калі яны прыйшлі па прафесійныя веды, а не за «вокладкі», то зацікаўлены ў самастойным выкананні праектаў і самаадукацыі наогул.

Вядома, бескантрольнае распаўсюджанне і выкарыстанне штучнага інтэлекту можа прывесці да плагіяту, і ў рэшце рэшт на выхадзе мы не атрымаем кваліфікаванага спецыяліста. Аднак менавіта ў нас гэта малаверагодна. Па-першае, бо «выпадковых» студэнтаў у нас бадай што няма. Па-другое, тэхнічная накіраванасць універсітэта значна абмяжоўвае магчымасці карыстання штучным інтэлектам — інжынерныя курсавыя і дыпломныя праекты маюць на ўвазе акрамя неабходных разлікаў яшчэ і графічную частку. То-бок ва ўсялякім выпадку студэнту давядзецца папрацаваць самому. Ну а пра абарону такіх работ і гаварыць няма чаго — адсутнасць ведаў заўжды на паверхні.

Разам з тым штучны інтэлект можа стаць карысным і моцнай дапамогай у справе адукацыі. Але толькі пры ўмове яго асэнсаванага, кантралявальнага і этычнага выкарыстання. Прасцей кажучы, ён павінен дапамагаць студэнцкай думцы, а не падмяняць яе: даследаванні і крытычнае мысленне застаюцца галоўнымі аспектамі адукацыйнай і навуковай дзейнасці, і нельга іх замяняць штучным інтэлектам.

## Пра студэнтаў

***— Вы сказалі, што «выпадковых» студэнтаў у вас фактычна няма. А ці многа тых, хто прыйшоў вучыцца, ужо вызначыўшыся не толькі з прафесіяй, але і з месцам работы — так званых мэтавікоў? І ўвогуле, які ён, студэнт аграрнага тэхнічнага?***

— Сапраўды, практычна ўсе нашы студэнты прыходзяць ва ўніверсітэт свядома, выразна ўяўляючы, дзе і як ім давядзецца працаваць. У большасці сваёй яны ўжо з маленства ведаюць, што такое праца на зямлі. І не цураюцца яе, і ведаюць, як гэта — жыць у вёсцы, дзе ўсё на вачах — і добрае, і не вельмі. Можа, таму і адрозніваюцца яны ад навучэнцаў іншых ВНУ большай сціпласцю, дабрынёй, гатоўнасцю дапамагчы. Асабіста ў мяне толькі такія ўражанні ад нашых хлопцаў і дзяўчат. Ды што тут многа гаварыць, вось просты факт — універсітэт быў утвораны ў жніўні 1954 года, а фактычна заняткі пачаліся толькі ў кастрычніку. Чаму? Таму што студэнты працавалі, дапамагалі гаспадаркам збіраць ураджай. Вось так. Сёння, калі цікаўлюся вынікамі вытворчых практык у кіраўнікоў гаспадарак, часцей за ўсё чую: «Талковыя хлопцы, рукастыя. Потым да сябе забяру...» Гэта, бадай, найвышэйшая ацэнка практыкантам. І нам, выкладчыкам...

Што да студэнтаў, якія навучаюцца па мэтавых накіраваннях, то іх на сёння 40 % ад агульнай колькасці бюджэтнікаў. Дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы заключаны з 213 установамі — гэта абласныя і раённыя выканкамы, непасрэдна сельгаспрадпрыемствы.

Апошні варыянт, дарэчы, самы аптымальны як для гаспадарак, так і для навучэнцаў. Па-першае, кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства дакладна ведае, каго яно адпраўляе вучыцца: на лайдака і безадказнага ніхто грошы траціць не будзе. Гэта і пра тое, што студэнтам-мэтавікам за добрую вучобу прадпрыемствы плацяць дадатковую стыпендыю — да 20 базавых велічынь. Па-другое, студэнты таксама ведаюць прадпрыемства, людзей. А значыць, і адаптацыя будзе праходзіць на парадак лягчэй. У гэтым сэнсе, лічу, трэба абавязкова сказаць: адносіны да маладых спецыялістаў з боку кіраўніцтва і другіх работнікаў увогуле — вельмі важная рэч. Колькі разоў здаралася, што маладыя з'язджалі з гаспадаркі толькі з-за зняважлівасці калег. Здаецца, абсалютна кожны ведае: моладзі трэба дапамагаць, нездарма ж інстытут настаўніцтва існуе. Але ж...

Асобна звярну ўвагу на тое, што сур'ёзная частка мэтавікоў — выпускнікі агракласаў. На сёння ў краіне дзейнічаюць (з 2017 года) 900 такіх класаў, яны важная частка прафарыентацыйнай работы сярод старшакласнікаў, якая прыносіць вялікі плён. У гэтым сэнсе згадаю і нашу навучальна-навукова-вытворчую асацыяцыю «Аграінжынер», якая аб'ядноўвае 18 аграрных каледжаў і, акрамя ўсяго іншага, дазваляе выбудаваць пераемнасць адукацыі.

А ў цэлым, я ўпэўнены, што прафарыентацыйную работу трэба пашыраць і ўсялякімі спосабамі папулярызаваць працу ў вёсцы. Бо, сапраўды, як бы ні пафасна гэта гучыць, але ўсё пачынаецца менавіта на зямлі, а праца хлебароба — самая ганаровая.

***— Але ж студэнты не толькі вучацца...***

— Зразумела. Ва ўніверсітэце створаны ўсе ўмовы для таго, каб яны маглі з карысцю бавіць вольны час і рэалізаваць свае творчыя здольнасці. Дзеля гэтага пабудаваны асобны корпус — Маладзёжны цэнтр БДАТУ. Там дзейнічаюць 54 клубныя фарміраванні розных кірункаў, ёсць у нас свой тэатр — «Праметэй», арт-фолк гурт «Велес», які ў мінулым годзе заваяваў Гран-пры VII Міжнароднага конкурсу «GRAND FESTIVAL» у Італіі...

Карацей кажучы, сумаваць ім не даводзіцца: хочаш творчасцю займайся, хочаш — спортам, для заняткаў ім таксама ёсць усё, што патрэбна. А нашы цяжкаатлеты, байцы муай-тай і кікбаксёры неаднаразова станавіліся пераможцамі і прызёрамі рэспубліканскіх і міжнародных турніраў.

Скажу яшчэ колькі слоў пра студатрадаўскі і валанцёрскі рух. Тут таксама ёсць чым ганарыцца: кожны трэці студэнт дзённай формы навучання — удзельнік студатрадаўскага руху, гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у краіне. А наш міжнародны студатрад «Зорка» па выніках мінулага года ўвогуле прызнаны найлепшым. Іншыя — валанцёры, іх аб'яднанне завецца «САВА». Дапамагаюць састарэлым, дзецям з дзіцячых дамоў і сацыяльных прытулкаў. Калі трэба — прыходзяць на дапамогу гарадскім службам.

Я лічу, што гэта адзін з паказчыкаў патрыятызму нашых студэнтаў, выхаванне якога — першачарговая задача нашага ўніверсітэта. Сапраўды, яны гатовы працаваць на карысць Радзімы і працуюць дзе толькі можна, нягледзячы ні на што. А ці не гэта сапраўдны патрыятызм?

## Пра навуковую дзейнасць і міжнароднае супрацоўніцтва

***— Універсітэт не толькі навучальная ўстанова, але і навуковы цэнтр сельскагаспадарчай галіны. Наколькі вынаходніцтвы знаходзяць сваё месца ў вытворчасці? Ці ёсць цяжкасці з іх укараненнем?***

— Сапраўды, навуковая дзейнасць складае важную частку агульнай дзейнасці ўніверсітэта. Навукоўцы, аспіранты, магістранты і студэнты паспяхова працуюць над навукова-даследчымі работамі ў рамках пяці дзяржаўных навуковых праграм і праектаў Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. Толькі ў мінулым годзе агульная колькасць ужо выкарыстаных вынікаў работ — больш за 30. Каб не быць галаслоўным, згадаю распрацаваную намі ўмацавальную тэхналогію рабочых механізмаў дыскавай навяснай касілкі КДН-210, якая выпускаецца на Бабруйскаграмашы. Дзякуючы распрацаванай тэхналогіі рэсурс дэталяў касілкі цяпер не саступае больш дарагім замежным аналагам — важны крок на шляху імпартазамяшчэння і зніжэння сабекошту прадукцыі.

Радуе, што ў большасці кіраўнікоў сельгасарганізацый ёсць разуменне важнасці, я нават бы сказаў — неабходнасці ўкаранення вынікаў навуковых даследаванняў, у тым ліку і студэнцкіх, у вытворчасць. Дзякуючы такому ўзаемапаразуменню, з многімі прадпрыемствамі ўжо наладжана доўгатэрміновае супрацоўніцтва, вынік якога — канкурэнтаздольная прадукцыя і развіццё вытворчасці.

***— Развіццё навуковага досведу нельга ўявіць без міжнароднага супрацоўніцтва. Як складваюцца адносіны з замежнымі навучальнымі і навуковымі ўстановамі?***

— Міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва — адзін з галоўных кірункаў дзейнасці ўніверсітэта, яно дынамічна развіваецца шляхам сумеснай з замежнымі вучонымі навуковай работы, абмену вынікамі даследаванняў і вопытам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. На сёння наладжаны трывалыя партнёрскія кантакты з больш чым 100 замежнымі ўстановамі адукацыі і навуковымі арганізацыямі. У апошнія гады ўніверсітэт выконваў сумесныя міжнародныя навуковыя і навукова-тэхнічныя праекты з навуковымі і адукацыйнымі ўстановамі Францыі, Швецыі, Узбекістана, Расіі і Казахстана. У планах — сумесны навуковы праект з кітайскімі партнёрамі.

Дадам, што ўніверсітэт штогод арганізоўвае стажыроўкі для замежных спецыялістаў-аграрыяў з Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Узбекістана, Манголіі і шэрагу іншых краін. У гэтым годзе, напрыклад, БДАТУ і акцыянернае таварыства «Цэнтр міжнародных праграм» (Рэспубліка Казахстан) дамовіліся аб арганізацыі навуковых стажыровак маладых вучоных і спецыялістаў — стыпендыятаў Міжнароднай стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан «Болашак». Доўжыцца стажыроўкі будуць ад 2 тыдняў да 5 месяцаў.

Пасля візіту Прэзідэнта ў Экватарыяльную Гвінею рыхтуемся прыняць спецыялістаў з краіны — ужо атрымалі адпаведнае распараджэнне Мінсельгасхарча. Яны будуць вывучаць тэхналогіі агрэгатавання нашай тэхнікі. Упэўнены, што справімся з гэтай задачай паспяхова, тым больш што ў нас ужо ёсць вопыт работы са студэнтамі з Афрыканскага кантынента.

## Пра планы

***— Новы год для ўніверсітэта асаблівы — БДАТУ адзначыць 70-гадовы юбілей. Канешне, трэба пацікавіцца планамі...***

— Планы... Што тут скажаш, іх многа, але і агучваць не вельмі хочацца, бо, як кажуць, «хочаш рассмяшыць Бога...» Так, не здзіўляйцеся, людзі навукі таксама часам вераць у прымхі. А калі сур'ёзна, то адзін з галоўных прыярытэтаў — якасць адукацыі, тым больш што гэты год абвешчаны Годам якасці. Будзем і далей удасканальваць навучальны працэс у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі — трэба ж утрымліваць узнятую ў мінулым годзе планку ўладальніка Гран-пры Міжнароднай бізнес-прэміі «Лідар года 2022» у намінацыі «Адукацыя».

Акрамя таго, вызначу тры складнікі паспяховай дзейнасці ўніверсітэта, на якія будзем звяртаць пільную ўвагу: развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, навуковая дзейнасць і экспарт адукацыйных паслуг. Калі мы паспяхова справімся з пастаўленымі ў гэтых кірунках задачамі, то гэты год не прынясе ніякіх непрыемных сюрпрызаў, і ўніверсітэт, як заўсёды, будзе ўносіць годны ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў для аграпрамысловага комплексу краіны.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

**Фота з архіва БДАТУ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 10 %

Организатор аукциона: **ЗАО «Оценка Сервис»,** г. Гомель, ул. Лепешинского, 1.
Продавец: **ООО «Утилизатор»,** г. Гомель, ул. Федюнинского, 27 – в лице ликвидатора.

Торги состоятся **17 января 2024 года в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 25

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма адатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. Местонахождение лотов: г. Гомель, ул. Федюнинского, 27 | | | |
| **1** | Вышка-тура. Базовый блок ВСП 250/1,2 (н/н 3703). Вышка-тура. Комплект стабилизаторов (4 шт.) (н/н 3705). Вышка-тура. Секция ВСП 250/1,2 (10 шт.) (н/н 3704) | 333,72 | **33,37** |
| **5** | Набор головок и ключей 82 предм. 1/4", 1/2", 6-гр. (н/н 5862) | 69,12 | **6,91** |
| **7** | Набор инструментов 108 пр. (н/н 9183) | 162,00 | **16,20** |
| **11** | ПЭВМ N-Tech I-N (для видеонаблюдения) (н/н 6317) | 702,00 | **70,20** |
| **13** | Фотокамера цифровая Nikon CPX W300 YW (н/н 6919) | 399,60 | **39,96** |
| **14** | Фотоловушка «Филин 800 MMS» | 129,60 | **12,96** |
| **15** | Фотоловушка «Филин 800 MMS» | 129,60 | **12,96** |
| **16** | Экран с электроприводом 206*159 (н/н 2304) | 259,20 | **25,92** |
| **17** | Ноутбук Dell XPS157590-6671 (инв. № 1000229) | 3 024,00 | **302,40** |
| **18** | ПЭВМ «Redhost» (инв. № 1000129) | 637,20 | **63,72** |

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с продавцом по тел. **+375 (29) 141-87-38 –** Сергей Григорьевич (предварительная запись на осмотр имущества); **+375 (29) 345-09-66 –** ликвидатор Антоненко Ирина Олеговна (заключение договоров купли-продажи).

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ЗАО «Оценка Сервис»):** р/с BY94 BPSB 3012 3353 2001 9933 0000 в ОАО «Сбер Банк» г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 491382947, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №_ **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**. Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 января 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 25 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 января 2024 г. в 16.00 включительно.**

Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте ocenkaservis.gomel.by@mail.ru.

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 21.11.2023 г. № 225 (300955).

Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**

# ВАЕННЫЯ ВЁРСТЫ СЯРЖАНТА АНДРЭЙЧЫКАВА

**Былы пехацінец Андрэй АНДРЭЙЧЫКАЎ бадзёра сустракае мяне на парозе сваёй кватэры і галантна дапамагае зняць паліто. Падцягнуты, у ваеннай гімнасцёрцы, з узнагароднымі планкамі на грудзях, ён і сёння выглядае па-баявому. Нягледзячы на свае паважаныя 97 гадоў. Нават жартуе: «Пяхота — сто кіламетраў прайшла, і яшчэ ахвота». Смяецца, што іх так дражнілі на фронце. Колькі кіламетраў прайшоў насамрэч па вогненных дарогах вайны, ён не лічыў. А вось тое, што застаўся жывы, гэта цуд. З яго роты вярнуцца дамоў пашчасціла нямногім.**

## Карцінкі з даваеннага дзяцінства

Урэзаўся ў памяць эпізод з 1938 года, калі яны, пяцікласнікі, разам са сваім класным кіраўніком Вольгай Мікалаеўнай Карпінскай — будучай падпольшчыцай і маці гераічнай Тані Карпінскай, у гонар якой у Магілёве названа вуліца, — прыйшлі ў музей гісторыі рэлігіі і атэізму. Ён знаходзіўся ў велічным будынку былога Іосіфаўскага сабора, які пабудавалі ў XVIII стагоддзі па загадзе расійскай імператрыцы Кацярыны Вялікай у гонар яе сустрэчы з аўстрыйскім імператарам Іосіфам ІІ. Дом, у якім жыў Андрэй Андрэйчыкаў, якраз выходзіў вокнамі на храм. Сабор быў прыгожы звонку, але не хапала слоў, каб перадаць яго прыгажосць знутры. Сцены, купал — усё ў роспісах. Царкоўныя прадметы прыбралі, але засталася ўрачыстая ўзнёсласць. Пасярод вялізнай залы вісеў маятнік Фуко. Настаўніца прапанавала даведацца, на колькі градусаў павернецца вакол сваёй восі Зямля, пакуль яны будуць у музеі. Яна адцягнула маятнік у бок, за-


Андрэй Андрэйчыкаў разам з сястрой.

фіксавала яго і адпусціла: ён пачаў павольна гайдацца. А настаўніца з дзецьмі пайшлі глядзець экспанаты. У музеі было шмат незвычайнага. Школьнікаў уразіла шкляная вітрына, пад якой ляжала цела муміфікаванай жанчыны з мноствам упрыгажэнняў. А шкілет мамантa, біўні якога былі падвешаны да столі, выклікаў страх.

Хутка пасля таго паходу будынак знеслі. Напярэдадні да жыхароў дома, дзе жылі Андрэйчыкавы, прыйшлі нейкія людзі і папярэдзілі, што сабор будуць узрываць. Параілі заклеіць вокны паперай крыж-накрыж, каб іх не пашкодзіла выбуховай хваляй. «На наступны дзень раніцай прагрымеў магутны выбух, — успамінае суразмоўнік. — Паглядзелі ў акно, а сабора няма. Маці расплакалася: шкада было той прыгажосці».

## Гэта страшнае слова «вайна»

Пра вайну Андрэй Андрэйчыкаў даведаўся раней, чым паведамілі па радыё.

— Да нас у госці прыехаў мой стрыечны брат Валодзя, і мы пабеглі глядзець горад, — расказвае ветэран. — Па дарозе ў гарадскі парк паказваў брату тэатр, перад якім тады яшчэ стаяў вялікі помнік Леніну. На плошчы была вельмі цікавая скульптурная кампазіцыя, прысвечаная ахвярам вайны з белапалякамі. Мы там таксама затрымаліся. Пасля любаваліся Дняпром з глядзельнай пляцоўкі ў парку і слухалі музыку. Па нядзелях там заўсёды граў духавы аркестр. Раптоўна да музыкантаў падбег узрушаны малады мужчына і пракрычаў: «Прыпыніцеся! Вайна!» Блытана паведаміў, што яго сястра працуе на пошце і раніцай па сувязі перадалі гэту страшную навіну.

Хлопчыкі пабеглі дадому, хоць не верылі, што пачутае — праўда. На вуліцах Магілёва ўсё было спакойна, людзі гулялі, елі марожанае, смяяліся. Дома быў бацька, які таксама здзівіўся, калі дзеці яму паведамілі пра вайну. У кватэры было радыё, і яно працавала ў звычайным рэжыме. Хутка паведамілі, што Германія вераломна напала на Савецкі Саюз.

## Бой каля вёскі Гаі

У горадзе пачалася сумятня, людзі пабеглі скупляць у крамах усё: мыла, соль, газу, гарэлку, махорку. У Андрэевага бацькі ляжалі грошы ў ашчадным банку, ён пабег іх здымаць, а яму адмовілі. Сказалі, што грошы пайшлі на вытворчасць гармат, самалётаў і танкаў. Параілі прыйсці пасля вайны.

У горадзе адчувалася трывога, ніхто ўжо не ўсміхаўся. У Магілёве гасцяваў прыезджы цырк, і яго рыхтавалі да эвакуацыі. Клеткі з каштоўнымі жывёламі пагрузілі на грузавікі, а слана прывязалі да машыны, і ён ішоў следам. Побач з ім крочый апрануты ў арлекін пагоншчык. Андрэй супраджаў гэтую працэсію да галоўпаштамта. З цыркам было звязана ўсё яго дзяцінства. Драўляны манеж, дзе адбываліся прадстаўленні, таксама быў непадалёк ад іх дома. І хлопчык з сябрамі вельмі часта бегаў туды дапамагаць даглядаць жывёл.

Вайна ўсё больш нагадвала пра сябе. З захаду праз Магілёў ішлі калоны машын, прабіты снарадамі ад бамбёжак і замаскіраваныя галінкамі. Увялі карткі на прадукты, у тым ліку на хлеб. Жанчыны плакалі, выпраўляючы мужчын на фронт. У горадзе заставаліся толькі тыя, у каго была бронь. «Мой бацька электрыкам быў, забяспечваў электрычнасцю у горадзе, таму яго на фронт і не ўзялі, — расказвае ветэран. — Калі Магілёў пачалі бамбіць, ён перавёз нас да родных у вёску Купёлы, што пад Магілёвам, а сам вярнуўся дамоў».

Усе 23 дні, пакуль трымаў абарону Магілёў, вакол яго ўсё грымела і гарэла. Высока ў небе вісеў нямецкі аэрастат, з якога немцы карэкціравалі артылерыйскі агонь. Потым сціхла, і маці паслала сына


Андрэй Цімафеевіч — баец па жыцці.

ў горад паглядзець, ці жывы бацька. Яна спадзявалася, што немцы падлетка чапаць не будуць. Да горада ж не вельмі далёка, усяго кіламетраў 12. Хлопец асцярожна прабіраўся па ўскрайку лесу, які цягнуўся ўздоўж грунтавой дарогі Шклоў — Магілёў. Па ёй зусім яшчэ нядаўна грукатала нямецкая тэхніка. Асабліва жахліва было ісці каля вёскі Гаі.

— Улева і ўправа — акопы, а ў іх забітыя чырвонаармейцы, — успамінае ветэран. — На вочы трапіў адзін з напалову адарванай галавой. Лепш бы я на яго не глядзеў. Ён яшчэ доўга стаяў у мяне перад вачыма. Далей ішла адкрытая мясцовасць, практычна ўся высланая целамі забітых байцоў у сіняй форме. Гэта быў той самы гераічны батальён міліцыі, якім камандаваў капітан Уладзіміраў.

Занепакоены лёсам бацькі, падлетак амаль бег у горад. Магілёў было не пазнаць. Разбураныя і спаленыя будынкі, забітыя людзі — ад убачанага сціскалася сэрца. Вось, нарэшце, і іх дом, дзверы ў кватэру расчыненыя. Хлопец зайшоў унутр і застыў на парозе. Кватэра пустая, нічога, акрамя металічных ложкаў, няма. І спытаць, дзе бацька, няма ў каго. Выбег з дома і на вуліцы ўбачыў знаёмых жанчын. Ад іх даведаўся, што ўсіх мужчын немцы сабралі і пагналі пешшу ў напрамку вёскі Ермалавічы — там знаходзіўся лагер палонных. Прыйшлося хлопцу вяртацца дадому ні з чым. Але хутка ў вёску вярнуўся бацька. Маці плакала ад радасці.

## Маршавая рота

У чэрвені 1944-га Магілёў быў вызвалены і пачаўся прызыў моладзі 1926 года нараджэння. Пад яго трапляў і Андрэй Андрэйчыкаў. У ваенкамаце яго запісалі і папярэдзілі, што хутка выклікаюць. Пакуль чакаў, паспеў паўдзельнічаць у работах па аднаўленні чыгуначнага вакзала. Ад будынка засталіся адны сцены. Трэба было ачышчаць памяшканні ад завалаў. Малады чалавек так спрытна арудаваў рыдлёўкай, што яго прыкмеціў капітан чыгуначнага ведамства і прапанаваў працаўладкавацца. Гэта давала бронь. Але калі малады чалавек прынёс гэтую паперу ў ваенкамат, яго прысаромілі. І ён адмовіўся ад прывілею. Перад тым, як трапіць на фронт, прайшоў вучэбку ў Казельску. З Магілёва навабранцы ішлі туды спачатку пешшу, затым ехалі на цягніку, потым зноў ішлі. Непадалёк ад Казельска іх перахапіў галодны натоўп людзей. Хлопцы неслі з сабой трафейныя мясныя кансервы і хлеб. Амаль усё аддалі знясіленым людзям. Хутка самі адчулі голад. Елі посную баланду з тазікаў. Садзіліся па крузе і сёрбалі.

На фронт маршавую роту адпраўлялі ўрачыста. На вакзале іграў аркестр, нехта выступіў з прамовай з трыбуны. Потым маладое папаўненне прайшло страявым крокам да цягніка, які ўзяў курс на захад.


Будучы пехацінец напярэдадні вайны.

## Першы бой

Калі пад'язджалі да Магілёва, Андрэй услых шкадаваў, што не хапае часу на хвілінку забегчы дамоў, пабачыць родных. Бывалыя, ужо з узнагародамі на грудзях, раілі не вагацца: бяжы, казалі, іншага разу можа і не быць. А калі не паспееш на гэты цягнік, паедзеш на іншым. Туды, маўляў, заўсёды паспееш. Але хлопец пабаяўся кінуць роту. І нікуды не пабег.

Фронт грымеў ужо за Варшавай, а навабранцы захраслі каля Ваўкавыска. Кожны дзень з іх ліку бралі людзей для папаўнення падраздзяленняў. Дайшла чарга і да сяржанта Андрэя Андрэйчыкава.

— Завезлі нас у польскую вёску і загадалі днём на вуліцы нават не паказвацца, — успамінае ён. — Сказалі, што за калючым дротам ужо нямецкая абарона. Праз некаторы час паведамілі, што ноччу ідзём у бой. І параілі не есці. Маўляў, калі куля трапіць у жывот, будзе цяжка аперыраваць. Пасля такой перасцярогі есці ўжо нікому не хацелася.

Ноччу чырвонаармейцам загадалі ланцугом ісці да дроту. Трэба было ўвесь час быць напагатове. Немцы перыядычна запускалі ракеты, і ўсё навакол асвятлялася як днём. Прыходзілася ляжаць на зямлі і чакаць, пакуль згасне. Ноч правялі ў акопах, а раніцай па пазіцыях ворага стала біць савецкая артылерыя. Нарэшце паляцела зялёная ракета — знак ісці ў наступленне.

— Камандзір роты ўкраінец Краўчанка загадаў бегчы за ім, — расказвае ветэран. — Мы паўскоквалі і пабеглі. Дроту ўжо не было, артылерыя знесла, толькі слупкі валяюцца. Узялі курс на ўзлесак. Нечакана адтуль выходзіць немец з вялікай белай прасцінай і ідзе да нас. Камандзір камандуе: не страляць. Немец дайшоў да нас і здаўся ў палон. Пасля гэтага з узлеску з узнятымі ўгору рукамі сталі выходзіць іншыя немцы. Іх было нават болей, чым нас. Мы іх прапусцілі да нашых у тыл, а самі наперад, па кустах страляем, каб праверыць, ці застаўся яшчэ хто. Нечакана на гарызонце паказаліся машыны, з якіх сталі выскокваць немцы. Мы па іх страляць, а яны зноў у машыны і назад. А потым па нас пачалі біць з мінамётаў. Камандзір загінуў на месцы.

Потым яшчэ былі баі. Немцы ўжо не здаваліся, наадварот, адчайна супраціўляліся. Шмат хто з баявых таварышаў Андрэя Андрэйчыкава загінуў. Лягчэй было, калі наступалі пад прыкрыццём танкаў. Можна было схавацца за жалезную машыну, там куля не адразу знаходзіла. А на календары ўжо быў май 1945-га.

— Калі мяне параніла, з роты колькасцю 120 чалавек заставалася толькі 24, — расказвае франтавік. — Снарад разарваўся дзесьці побач, і асколкі ад яго пырснулі па баках веерам. Адзін трапіў мне пад каленную чашачку, ад рэзкага болю страціў прытомнасць. Калі прыйшоў у сябе, убачыў нашых санітараў. Вусаты сяржант медыцынскай службы падміргнуў мне і з украінскім акцэнтам сказаў: «Шчасливі ты чоловік». Сапраўды, шчаслівы. Вакол шмат было



Камсамольскі білет сяржант Андрэйчыкаў атрымаў перад адпраўкай на фронт.

забітых. Нага балела вельмі моцна, немагчыма было стаць на яе. У шпіталі яе цалкам загіпсавалі. Аднойчы сон прыпыніла моцная страляніна. Няўжо немцы? Але сястрычка забегла ў палату і пракрычала: «Родненькія, Перамога!». Што тут пачалося! Усе, хто мог рухацца, паўскаквалі на ногі, сталі цалавацца, абдымацца. Па шчоках цяклі слёзы, але іх ніхто не саромеўся...

Дадому Андрэй Андрэйчыкаў вярнуўся не адразу, яшчэ сем гадоў служыў у групе савецкіх акупацыйных войскаў у Германіі. Яго баявы шлях адзначаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны І ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі», «За Перамогу над Германіяй». І самай вялікай узнагародай за перажытае стала тое, што ніхто з сям'і не загінуў. На той вайне гэта было сапраўдным цудам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

# НОВАЯ ПАРАХАВАЯ БОЧКА ЕЎРОПЫ

## Балта-чарнаморская дуга і яе суб'екты: расстаноўка сіл

**Вось Балтыка — Чорнае мора адыгрывае важную ролю ў стратэгіі Захаду па стрымліванні Расіі. Першачарговай задачай для заходняй палітыкі ў рэгіёне з'яўляецца стварэнне рознафарматных антырасійскіх блокаў і саюзаў з тутэйшымі дзяржавамі. Лічыцца, што такім чынам атрымаецца «перагарадзіць» балта-чарнаморскі калідор бар'ерам, праз які расійскі ўплыў не зможа дасягнуць Еўропы. Для Еўропы гэта азначае звужэнне перспектыў супрацоўніцтва з Масквой па шэрагу стратэгічна неабходных кірункаў, найперш у энергетыцы. Такая канфігурацыя выгадная Злучаным Штатам і іх саюзнікам з ліку краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы (Польшча, Літва, Румынія), але не краінам-лакаматывам еўрапейскай эканомікі (Германія, Францыя, Італія). Пра гэта і не толькі мы пагаварылі з палітолагам, кандыдатам палітычных навук Усеваладам ШЫМАВЫМ.**



***— Усевалад Уладзіміравіч, я прашу вас падзяліцца інфармацыяй, якой валодаеце ў сілу сваіх прафесійных заняткаў — аналіз падзей у прыбалтыйскім рэгіёне, краінах Балтыі, паўночных краінах, у Польшчы. Я сфармуляваў бы тэму «Пагражаючая Прыбалтыка». У гэтым рэгіёне, блізу Балтыйскага мора, размешчаны краіны, якія агрэсіўна паводзяць сябе ў дачыненні да Беларусі і Расіі, рыхтуюцца да ваенных дзеянняў супраць нашых краін.***

— Я ўзяў бы нават шырэйшы кантэкст. Тое, што цяпер адбываецца — фарміраванне канфліктнай балта-чарнаморскай дугі рэгіёна ад Чорнага мора да Балтыйскага з паўднёвай ускраінай — Украінай, паўночнай — Эстоніяй і Фінляндыяй. Гэтую канфліктную дугу я назваў бы новымі Балканамі. Многія справядліва лічылі Балканы парахавой бочкай Еўропы. І цяпер там шмат якія тлеюць канфлікты. Але на сёння Балканы больш-менш стабілізаваны (хоць апошнія падзеі ў Сербіі выклікаюць занепакоенасць). А вось такая «балканізацыя» адбываецца ў нашым рэгіёне Чорнага і Балтыйскага мораў, часткай якога з'яўляецца і Беларусь. Мы якраз знаходзімся на гэтым балтыйска-чарнаморскім водападзеле. Арыентавана наша краіна да Чорнага мора ў меншай ступені, да Балтыкі — у большай. Гэта значыць, Беларусь — балтыйская краіна, мы частка балтыйскага рэгіёна, хоць не маем прамога выхаду да мора. І тое, што адбываецца ў Прыбалтыцы, датычыцца нас непасрэдным чынам.

***— Даўняя польская ідэя — новая Рэч Паспалітая ад мора да мора — дагэтуль жывая, больш за тое, яна ў польскіх эліт — сярод стратэгічных мэт.***

— Так, безумоўна. Гэта ў прынцыпе нармальная гісторыя. Многія краіны з імперскай вялікадзяржаўнай традыцыяй маюць праекты. Польшча адносіцца да ліку такіх краін. Але геапалітычная праблема ў тым, што гэтыя праекты адзін на другі накладваюцца. І яны ўваходзяць у канфлікт адзін з адным. Натуральна, праект вялікай Рэчы Паспалітай пагражае інтарэсам Беларусі і Расіі, іншых краін — тых жа Венгрыі, Румыніі.

***— Значыць, рэгіянальныя геапалітычныя праекты — рэальнасць. Калі казаць пра Польшчу — у чым заключаецца небяспека?***

— Небяспека не ў тым, што ў яе ёсць амбіцыі самі па сабе, а ў тым, што гэтыя амбіцыі моцна стымулююцца, у першую чаргу Злучанымі Штатамі Амерыкі. Польшча для ЗША з'яўляецца своеасаблівым стратэгічным плацдармам у Еўропе. Прычым ЗША выкарыстоўваюць Еўропу дваяка. Як супраць Расіі, так і супраць Германіі. Польшчу ў свой час Жак Шырак назваў «траянскім канём» ЗША ў Еўрасаюзе. Гэтая аналогія круціцца ў многіх на языку. Гэта з аднаго боку. З іншага — гэта ўзаемны працэс. Як часта кажуць, хвост круціць сабакам. Польшча выкарыстоўвае саюзніцтва з ЗША ў сваіх інтарэсах — для стварэння нейкай новай Рэчы Паспалітай, у ходзе рэалізацыі яшчэ больш амбіцыйнага праекта міжмор'я. Мы не можам казаць пра Польшчу як пра краіну-марыянетку ЗША. Гэта краіна са сваёй суб'ектнасцю, безумоўна. Хоць гэта краіна другога плана, але ў нейкай меры лідар. Нават у ЕС палякі ўсведамляюць сваю адносную слабасць, нават у параўнанні з Германіяй, нават па эканоміцы. Але Польшча — краіна з суб'ектнасцю. У яе ёсць дакладнае мэтапакладанне, чаго яна хоча. Яна рухаецца да гэтых мэт, выкарыстоўваючы магчымыя рэсурсы. Ёсць магчымасць абаперціся на ЗША — абапіраецца на ЗША. І тут ідзе ўзаемнае выкарыстанне адно аднаго. Ёсць магчымасць выкарыстоўваць Еўрапейскі саюз — выкарыстоўвае яго вельмі эфектыўна для развіцця сваёй эканомікі. Пры гэтым вельмі актыўна дзейнічае насуперак ЕС, насуперак той жа Германіі.

Палякі прынялі нарматыўныя дакументы, якія часта супярэчаць дакументам ЕС. І Еўрапейскі саюз нічога з Польшчай зрабіць не можа. Гэта сёння вельмі сур'ёзны гулец — рэгіянальны, мэтанакіраваны. І недаацэньваць Польшчу не варта. Не трэба ставіцца да яе як да краіны без суб'ектнасці.

***— Сітуацыя пасля выбараў у Польшчы можа расставіць некаторыя іншыя акцэнты...***

— Я не думаю, што нешта зменіцца. Гэта асаблівая ўнутрыпольская гісторыя. Там фактычна двухпартыйная сістэма. Ёсць партыя «Права і справядлівасць» і партыя «Грамадзянская платформа» — цяпер шырэйшая — грамадзянская кааліцыя. У чым адрозненне паміж імі? «ПіС», якія выбары прайгралі, — гэта такія класічныя польскія нацыяналісты, кансерватары з апорай на каталіцкую царкву, на традыцыйныя каштоўнасці. Гэтая партыя еўраскептычная. У яе ярка выяўленыя еўраскептычныя і праамерыканскія пазіцыі адпаведна. Гэтая партыя прытрымліваецца жорсткай брутальнай рыторыкі. А грамадзянская кааліцыя, якая прыйшла да ўлады, — польскія ліберaлы. Яе пазіцыі — праеўрапейскія. Яна больш арыентавана на Брусель, чым на Вашынгтон. Урад на аснове грамадзянскай платформы — гэта добрая навіна для Еўропы. Гэтая партыя пашырае ў польскім грамадстве еўрапейскі парадак дня: экалогія, правы сексуальных меншасцяў, разнастайнасць. А ўнутры польскага грамадства існуе каштоўнасны канфлікт. Польшча намі ўспрымаецца як краіна кансерватыўная, каталіцкая. Але на самай справе там ідзе трансфармацыя цяпер. Ёсць вялікі працэнт — традыцыяналісцкі. Гэта ў асноўным людзі старэйшага ўзросту і жыхары малых гарадоў. А жыхары буйных гарадоў, асабліва жыхары заходніх тэрыторый, якія дасталіся Польшчы пасля Другой сусветнай вайны, гарадскія жыхары ўжо ліберальныя, праеўрапейскія. Яны, у асноўным, супраць «ПіС». Такім чынам, мы назіраем у Польшчы сутыкненне дзвюх мадэляў ідэнтычнасці.

***— Такая расстаноўка палітычных сіл можа неяк паўплываць на знешнюю палітыку?***

— Калі казаць аб знешняй палітыцы Польшчы, то трэба аб парламенце таксама сказаць: у пазіцыі тых і іншых палітычных сіл ёсць адзінства ў дэструктыўным стаўленні да Беларусі і Расіі. Для Захаду больш прынцыповае пытанне — арыентацыя Польшчы на Брусель і на ЗША. Рыторыка розных палітычных сіл крыху адрозніваецца. «Права і справядлівасць» пашырала імперскі, вялікадзяржаўны парадак дня: адраджэнне магутнасці, велічы, мілітарызацыя, кантроль над тэрыторыямі. Такая пазіцыя закранала інтарэсы Беларусі — яна пра Крэсы Усходнія, пра нейкую польскую спадчыну на тэрыторыі Беларусі, мусіравала тэму правоў палякаў у Беларусі. Грамадзянская кааліцыя будзе рабіць тое самае, але пад іншымі лозунгамі: пашырэнне дэмакратыі, барацьба з карупцыяй. «Грамадзянская платформа» будзе расказваць аб парушэнні правоў і свабод у Беларусі і г. д. Па сутнасці той жа самы негатыў супраць нашай краіны, але пад іншай ідэалагічнай падліўкай. Для нас што тое, што другое — прынцыповай розніцы няма. Абедзве палітычныя сілы цяжка назваць сябрамі Беларусі.

***— З Польшчай зразумела. А вось паўночныя нашы суседзі — Літва, Латвія, Эстонія...***

— Гэтыя краіны пасля распаду СССР занялі спецыфічную палітычную нішу. Гэта, вядома, праблема распаду Савецкага Саюза, якая заключаецца ў тым, што практычна ва ўсіх постсавецкіх, постсацыялістычных краінах да ўлады прыйшлі русафобскія эліты — дзесьці ў большай, дзесьці ў меншай ступені. Але грымучая сумесь атрымалася русафобіі і антыкамунізму. Прыбалтыка не стала выключэннем. Таму ўвесь постсавецкі перыяд гэтыя краіны праводзілі адпаведную палітыку. Яны паслядоўна рвалі сувязі з Расіяй і Беларуссю і ўвесь час палохаюць тэму пагрозы з Усходу. Можна нават сказаць, што спецыялізацыя гэтых краін у міжнароднай і еўрапейскай палітыцы — роля абаронцаў Еўропы ад нейкай пагрозы з Усходу. Гэта, па-свойму, зручная пазіцыя, якая дае дывідэнды. Гэта дазваляе выгандлёўваць нейкія сродкі, субсідзіраванне, фінансаванне. Чаму? Таму што такая аднабаковая палітыка прывяла да таго, што гэтыя краіны па эканоміцы праселі ў вытворчасці, прамысловасці — усё абвалілася. У тым ліку і таму, што ўсё было арыентавана на постсавецкую прастору. Уся прадукцыя, якая выраблялася, умоўна кажучы, рыжскім вагонабудаўнічым заводам — электрычкі, усё гэта сышло адсюль. Еўропе гэта не трэба. Цяпер у Прыбалтыцы ідзе замяшчэнне. Калі браць чыгуначную галіну, замяшчэнне старога рухомага састава еўрапейскімі вытворцамі: Шкода, Штадлер. Рыжскі вагонабудаўнічы завод трымаецца за кошт рамонту старых цягнікоў, якія яшчэ не спісаны. Калі страчаныя свае традыцыйныя рынкі, трэба нешта шукаць узамен. Узамен можна знайсці толькі ўліванні з боку Захаду. Іх атрымаць не так проста, але магчыма — пад нейкую пагрозу. І прыбалты выступаюць нібыта абаронцамі ўсяго цывілізаванага свету ад Расіі. Пад гэта просяць грошы. На ваеннае будаўніцтва, інфраструктуру і гэтак далей. Тут зноў жа, акрамя асаблівасцяў саміх прыбалтыйскіх краін, амерыканскія інтарэсы прысутнічаюць. У прынцыпе краіны Прыбалтыкі — гэта пятая калона ЗША, тыя ж «траянскія коні» амерыканскія. Амерыканская палітыка «падзяляй і пануй» у дзеянні. Амерыцы выгадна аслабленне як Расіі, так і Еўрасаюза. А каб гэта адбывалася, паміж Расіяй і Еўропай павінен быць вось гэты пояс краін, які будзе працаваць на пастаяннае прадуцыраванне канфліктнасці паміж ЕС і Расіяй, Беларуссю. Тут усё адно на другое накладаецца. Амерыканскія інтарэсы плюс спецыфіка постсавецкіх эліт, якія зрабілі сябе на гэтай рыторыцы вечнай барацьбы з Расіяй.

***— Таму пагрозу прыдумляюць, палохаюць насельніцтва еўрапейскіх краін, што Беларусь пойдзе Сувалкскі калідор адваёўваць, каб спрасціць шлях у Калінінград.***

— Я нават не сказаў бы, што гэта міфічная пагроза. Сапраўды, вось гэтая праблема Сувалкскага калідора мае месца. Але яна прадукуецца такой палітыкай нагнятання канфрантацыі. Цяпер мы маем канфігурацыю, якая нязручная нікому. Напраўду, у Расіі ёсць эксклаўная тэрыторыя, якая аддзелена ад мацерыка поясам недружалюбных краін. Тая ж Літва ўжо некалькі разоў пагражала абрэзаць транзіт. І працягвае падбірацца да гэтага пытання. Прыбалтыка закрыла паветраную прастору для расійскіх і беларускіх самалётаў. І зараз трэба лётаць у аблёт, г. зн. часткова блакада мае месца — з аднаго боку. З іншага боку, калі глядзець з пункту гледжання калектыўнага Захаду і НАТА, то, вядома, канфігурацыя ўсходняга фланга з'яўляецца не аптымальнай. Таму што вось гэты вузкі Сувалкскі калідор паміж Калінінградскай вобласцю і тэрыторыяй Беларусі, ён сапраўды вузкі, яго перарэзаць можна пры неабходнасці. І вось тут зноў жа геапалітычнае значэнне Беларусі ў балтыйскім рэгіёне вельмі добра відаць. Гэта значыць, праблемы Сувалкскага калідора для Захаду не будзе тады, калі Беларусь перастане быць саюзнікам Расіі. Нашу краіну будуць спрабаваць хістаць, у тым ліку каб устараніць вось гэтую праблему. Аб'ектыўна кажучы, у нашым рэгіёне сфарміраваўся вось такі вузел супярэчнасцяў. Як ён будзе вырашаны, мы пакуль не ведаем.

***— А сам Калінінград лічаць на Захадзе кінжалам у сэрцы Еўропы. Такі вобраз сфарміраваўся...***

— Там, дзе з'яўляюцца анклавы ці эксклавы, заўсёды з'яўляецца нагода для канфлікту. Наяўнасць тэрыторыі адной дзяржавы, якая акружана тэрыторыямі іншых дзяржаў, — гэта заўсёды крыніца для канфлікту, крыніца для канфрантацыі. Можна ўспомніць пачатак Другой сусветнай вайны. Данцыгскі калідор, калі Прусія па выніках Першай сусветнай вайны аказалася адрэзанай ад астатняй тэрыторыі Германіі тэрыторыяй ізноў аднаўленай Польшчы, што таксама стварыла канфліктную сітуацыю і стала адным з трыгераў пачатку Другой сусветнай вайны.

Вядома, падзел СССР па тых адміністрацыйных межах, якія склаліся на момант распаду, заклаў вось такія міны, як Калінінградская вобласць, што была ўключаная ў склад РСФСР як эксклаўная пасля таго, як прыбалтыйскія краіны сталі незалежнымі. Тады гэтая тэрыторыя ператварылася ў эксклаў, — гэта і стала крыніцай напружанасці, элементам балта-чарнаморскай крызіснай дугі.

**«Калі казаць аб знешняй палітыцы Польшчы, то трэба аб парламенце таксама сказаць: у пазіцыі тых і іншых палітычных сіл ёсць адзінства ў дэструктыўным стаўленні да Беларусі і Расіі. Для Захаду больш прынцыповае пытанне — арыентацыя Польшчы на Брусель і на ЗША. Рыторыка розных палітычных сіл крыху адрозніваецца. «Права і справядлівасць» пашырала імперскі, вялікадзяржаўны парадак дня: адраджэнне магутнасці, велічы, мілітарызацыя, кантроль над тэрыторыямі».**

**Гутарыў Леанід НОВІКАЎ.**

Матай на вус

# Паштоўка як падарунак

## Мода на віншавальныя карткі вяртаецца

**У магілёўскага народнага фотаклуба «Вясёлка» ёсць добрая традыцыя. Напярэдадні Новага года яго ўдзельнікі і прыхільнікі праводзяць фотаконкурс навагодніх паштовак пад знакам PF. Гэта дзве першыя літары ад французскага словазлучэння «Pour Feliciter» — «Каб павіншаваць». Сёлетні год не стаў выключэннем. Сябры па інтарэсах зноў спаборнічалі паміж сабой на найлепшую ідэю года і віншавалі адзін аднаго эксклюзіўным падарункам — фота з пазнакай PF.**

### ПАРАДУЙЦЕ СЯБРОЎ «ПЭЭФКАЙ»

**Фотамайстар Ірына САВОСІНА** ўдзельнічае ў фотаконкурсе навагодніх PF-паштовак з 2018 года. Дагэтуль проста абменьвалася з калегамі «пээфкамі». На яе погляд, конкурс цікавы тым, што захоўвае строгія правілы стварэння арыгінальнага фотатвора. Тут банальныя снегавікі і ёлкі не вітаюцца, галоўнае — ідэя, тое, што дакладна перадасць, якая падзея года стала для аўтара самай значнай. Сюжэт неабавязкова павінен быць зімовым, у кадры можа прысутнічаць любая пара года. Найвышэйшы пілатаж, гэта калі нават праз гады можна будзе пазнаць почырк таго, хто зрабіў «пээфку».

Не трэба быць прафесійным фатографам, каб уразіць незвычайным падарункам сяброў. Дастаткова ведаць, што для стварэння PF-фота, акрамя ідэі, важна прытрымлівацца яшчэ некалькіх патрабаванняў. Гэта адзіны памер — 9 на 15 сантыметраў, каб падарунак змясціўся ў стандартным канверце, а таксама прысутнасць на картцы тых самых загадкавых літарак PF і лічбаў надыходзячага каляндарнага года. Аўтарскі подпіс пажаданы, але гэта ўжо не прынцыпова.

— Традыцыя навагодняй віншавальнай фотапаштоўкі ўласнага вырабу прыйшла да нас у пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя, хутчэй за ўсё з Чэхаславакіі, — расказвае Ірына Савосіна. — Менавіта на старонках чэхаславацкіх фатаграфічных часопісаў сталі з'яўляцца тэматычныя артыкулы аб PF-ках і выдатныя падборкі саміх «пээфак». Поўныя гумару і аптымізму, сапраўднага фатаграфічнага шарму, гэтыя маленькія карцінкі хутка заваявалі сэрцы прыхільнікаў фатаграфіі. Неўзабаве «пээфкамі» ўжо абменьваліся фотаклубы, іх дарылі адзін аднаму фатографы, проста дасылалі поштай сябрам і блізкім. У нашых фотаклубах гэта стала папулярна дзесьці ў сярэдзіне 80-х. Сёння PF — гэта своеасаблівы аўтапартрэт, «паказальны выступ», маленькая творчая справаздача перад сабою і калегамі. Часам сур'ёзныя або жартаўлівыя, часта філасофскія ці авангардысцкія, гэтыя карцінкі заўсёды самабытныя, гэтак жа, як і іх аўтары.



У сілу сваёй элітарнасці і дробнасерыйнасці фатаграфічная мініяцюра стала прадметам абмену і калекцыянавання. Папоўніць сваю калекцыю можна толькі двума спосабамі — абмяняўшы пад Новы год сваю «пээфку» на чыюсьці іншую або атрымаць сюрпрыз ад сябра па пошце.

У клубе «Вясёлка» існуе цэлы архіў «пээфак». Сёлета ён папоўніўся новымі работамі.

— Да нас прыйшло шмат цікавых магілёўскіх аўтараў, — удакладняе Ірына Савосіна. — Гэта знак таго, што інтарэс менавіта да змястоўных фота павялічваецца. Дарэчы, у нашым конкурсе сёлета ўдзельнічала магілёўскі паштальён Святлана Марковіч. Яе сюжэты дакладна маглі б упрыгожыць тыя самыя паштоўкі, якія людзі перасылаюць адзін аднаму пад Новы год.

Усяго ў сёлетнім конкурсе ўдзельнічалі 33 фатографы з Магілёва, Мінска, Гродна, Асіповічаў, Масквы, а таксама далёкіх краін — Аўстраліі (Тасманія) і Ізраіля. Першае месца атрымаў прадстаўнік Асіповіцкага народнага фотаклуба «Раніца» Мікалай Кухарэнка, дзве работы якога літаральна ўсіх скарылі. Астатнія призы забраў народны фотаклуб «Вясёлка». На другім месцы са сваёй творчай знаходкай фотамайстар Валерый Маскалёў, трэцяе падзялілі Георгій Дондзік і Мікалай Бодак. Віншуем пераможцаў!

### МУЗЕЙНЫЯ КАЛЕКЦЫІ

Не меншую гістарычную каштоўнасць маюць звычайныя паштоўкі. У калекцыі абласнога краязнаўчага музея імя Е. Раманава іх болей чым 6 тысяч на любы густ. Некаторыя з іх прадстаўлены на навагодняй выставе побач з ёлачнымі цацкамі ў магілёўскім этнаграфічным музеі. Для большага ўплыву на гледача іх алічбавалі і павялічылі. Яны тут выглядаюць як сапраўдныя карціны.

— Каштоўнасць паштоўкі з гадамі ўзрастае, — усміхаецца **галоўны захавальнік фондаў Вольга МАЛАШЭНКА**. — Асабліва каштоўнымі для нас з'яўляюцца калядныя паштоўкі канца XIX стагоддзя. Традыцыя дарыць іх блізкім людзям прыйшла да нас з Еўропы. На той час гэта быў вельмі добры, самадастатковы падарунак. Паштоўка каштавала дорага. І выкананне яе было вельмі цікавым. Пры яе вырабе прымяняўся тэкстыль, кардон, яны рабіліся ў тэхніцы дэкупаж, з цісненнем. У савецкі час разнавіднасцяў паштовак было шмат, у тым ліку і вельмі добрай якасці. І сюжэты спачатку ствараліся цікавыя, у 80-я гады яны сталі больш спрошчаныя і схематычныя. Традыцыя высылаць паштоўку на Новы год і не толькі існавала да канца 90-х гадоў. Віншавалі блізкіх, родных, сяброў. Часам гэта быў нават не элемент падарунка, а асноўны падарунак. Сёння таксама шмат цікавых паштовак. І традыцыя віншаваць не толькі электроннымі іх аналагамі, але і папяровымі адраджаецца. І мы папаўняем свае фонды, у тым ліку і тымі паштоўкамі, якія дасылаюць у музей.





### ПОПЫТ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СЮЖЭТА

Пра тое, што цікавасць да навагодняй віншавальнай картачкі расце, сведчыць і той факт, што новая калекцыя гэтага тавару разышлася ў паштавікоў сёлета яшчэ да снежня.

— Пошта выпусціла цэлую серыю навагодніх паштовых картак і марак, і яны мелі вялікі попыт, — расказвае **намеснік дырэктара Магілёўскага філіяла прадпрыемства «Белпошта» Галіна МАРЧАНКА**. — У іх нельга было не ўлюбіцца — забаўныя Дзяды Марозы, мядзведзікі, снегавікі, снягуркі — вельмі прыгожыя карцінкі. Пакупнікі расхапілі іх як гарачыя піражкі. Упершыню за апошнія пяць гадоў нам прыйшлося надрукаваць яшчэ адну партыю. Так што мода на паштоўку вяртаецца. Але сёння ўсё залежыць не столькі ад папулярнасці гэтага віду перасылкі, колькі ад сюжэта самой паштоўкі. Некаторыя аматары купляюць іх для калекцыі. У гэтай серыі якраз ёсць карт-максімумы, якія з'яўляюцца прадметам цікавасці для калекцыянераў.

Паштоўка з новай калекцыі каштуе ўсяго 50 капеек, разам з маркай і перасылкай гэта крыху больш за рубель. Але паштавікі робяць сваім кліентам сюрпрызы і прапануюць акцыі. Напярэдадні Новага года паштовае аддзяленне № 30 у Магілёве правяло іх некалькі пад назваю «Навагодняя паштоўка». Тыя карткі, якія кліенты куплялі падчас акцыі, перасылаліся бясплатна.

На жаль, аб'ёмы сёння не тыя, што былі ў савецкія гады. Але ёсць адрасы, па якіх паштальёны носяць прыгожыя віншаванкі пастаянна. І **паштальён магілёўскага паштовага аддзялення № 30 Юлія КУРАЧОВА** гэта пацвярджае.

— Перад святамі попыт на паштовыя карткі значна ўзрастае, — удакладняе суразмоўца. — Калі іду разносіць пошту па дамах, бяру з сабой і паштоўкі на продаж. Яны хутка разыходзяцца. А колькі радасці ў чалавека, калі ўручаеш яму вось такі падарунак ад блізкага чалавека. Адна жанчына, у якой сын працуе ў Маскве, увесь час перапытвала, ці прыслаў ён ёй паштоўку. Прасіла асабіста ўручыць, каб не згубілася. Я так і зрабіла. Тая жанчына ледзь не плакала. Эмоцыі, калі бачыш радкі, напісаныя рукой, а не з дапамогай камп'ютара, вельмі хвалююць. Фізічна адчуваеш прысутнасць таго чалавека. Вельмі часта дарослыя дзеці прысылаюць віншавальныя карткі сваім бацькам з іншых гарадоў. І мне заўсёды прыемна ўручаць іх адрасатам. Радасць гэтых людзей перадаецца і іншым. А яшчэ я заўважыла, што попыт на паштоўку павялічваецца не толькі ў насельніцтва. Напрыклад, адна ўстанова закупіла ў мяне напярэдадні Нового года адразу 40 штук. Я і сама лічу, што гэта цудоўны падарунак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіваў суразмоўнікаў.**

Весткі з Кітая

# ЗАКЛЮЧАНА ДАМОВА З «СІНЬХУА»

**У пярэдадзень новага, 2024-га, года заключаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Выдавецкім домам «Звязда» і Кітайскім інфармацыйным агенцтвам «Сіньхуа» (з кітайскага боку дагавор падпісаў кіраўнік Маскоўскага бюро «Сіньхуа» Фань Вэйга).**

У газеты «Звязда», увогуле ў Выдавецкага дома «Звязда», склаліся добрыя партнёрскія адносіны з кітайскімі медыя. Найперш — у частцы абмену інфармацыяй. Традыцыйным у сеткавым выданні zviazda.by стала размяшчэнне навін пра розныя падзеі і з'явы сацыяльнага, эканамічнага, палітычнага жыцця ў Кітаі. Гэтай тэматыцы прысвечаны асобны раздзел — «Весткі з Кітая».

Згодна з падпісаным дагаворам, на інфармацыйных рэсурсах «Сіньхуа» будзе шматкрат шырэй выкарыстоўвацца інфармацыя, папярэдне размешчаная ў газеце «Звязда» альбо ў сеткавым выданні zviazda.by. Пра падзеі ў Беларусі, грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё нашай краіны карыстальнік, падпісчык навін у рэсурсах «Сіньхуа» даведаецца істотна болей.

— Мы спадзяёмся, што такая інфармацыйная, узаемавыгадная праца па абмене і навінамі, і аналітычнымі артыкуламі, рознага характару карэспандэнцыямі, рэпартажамі, — пракаментаваў сам факт падпісання дагавора паміж беларускім і кітайскім бакамі **намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Аляксей ЧАРОТА**, — паспрыяе пашырэнню стасункаў паміж Беларуссю і Кітаем увогуле, асабліва — у гуманітарнай, асветніцкай, адукацыйнай сферах. Чым болей мы будзем ведаць адзін аднаго, тым болей удасца выбудаваць канкрэтных партнёрскіх стасункаў, наладзіць сувязі ў арганізацыі турыстычных паездак нашых грамадзян, развіць кантакты паміж дзелавымі коламі Беларусі і Кітая.

**Кастусь ХАДЫКА.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Таццяна ЦВІРКО нарадзілася на Клеччыне. Скончыла Нясвіжскае педагагічнае вучылішча і філалагічны факультэт БДУ. Працавала ў Клецкім дзіцячым доме, загадвала яслямі-садком, настаўнічала ва ўстановах адукацыі раёна. Ведаюць аўтарку найперш як паэтку, але піша яна і прозу — апавяданні, эсэ. Гераіня новага твора Таццяны Цвірко мусіла зрабіць важны жыццёвы выбар і звярнулася па параду да любімай настаўніцы. Ад Веры Паўлаўны Аліна атрымала дзве парады, прычым адна з іх, на першы погляд, выключала другую... Якое ж рашэнне прыняла Аліна? І чаму спазнілася з чарговым візітам да настаўніцы аж на чатыры гады? Чытайце апавяданне Таццяны Цвірко.*

**Алена БРАВА.**

**Таццяна ЦВІРКО**

# Не спазніся...



Яшчэ ў белапенна-пяшчотным траўні, калі палалі чырванню ля школьнага будынка цюльпанавыя горкі, песцілі вока пышныя бэзавыя кусты ў парку, Аліна загадала сабе абавязкова наведаць Веру Паўлаўну, настаўніцу мовы і літаратуры, сваю самую класную класную. Найлепш, канешне, пад Дзень настаўніка, каб атрымаўся сапраўдны сюрпрыз.

Рашэнне такое прыйшло не само па сабе: перабірала свае кніжкі ды альбомы ў бацькоўскім доме і ўбачыла школьны выпускны здымак. Доўга не магла адвесці ад яго вачэй. Васямнаццаць юных твараў на фота, а пасярэдзіне, як мама-наседка сярод куранятак, — Вера Паўлаўна з шырокай шчырай усмешкай, ямачкамі на шчоках. Любімы настаўнік. Яна заўсёды была дагледжаная, з укладзенымі ў прычоску валасамі і ў туфельках на невялікіх абцасах, спакойная і ўпэўненая, інтэлігентная і нейкая своеасаблівая сапраўдная! Яе нельга было не любіць ці аслухацца. Напэўна, таму, што яна любіла сваіх вучняў шчыра, без крывадушнасці, кожнага па-свойму, як пальцы на руках: які б ні парэзаў — баліць. Нават мянушкі ў яе не было. З году ў год і бацькі, і дзеці ласкава называлі яе «Верка». А яшчэ яна ставіла адзнакі за веды «па справядлівасці». Вызубрыў троечнік верш, расказаў выразна, без запінкі — закрасуецца ў дзённіку выдатная адзнака, ды яшчэ з прыпіскай: «Малайчынка!» Не вывучыў выдатнік ці харашыст правілы, напісаў тэст з памылкамі — наракай на сябе. Будзе шчыпаць вока ацэнка «па заслугах». І прыпісачка можа быць: «Усё паправіма!»

Строгая была Верка. На яе ўроках заўсёды царавала рабочая цішыня, ніхто не асмельваўся пагуляць з тэлефонам, займацца іншымі справамі. Але разам са строгасцю і непрыступнасцю выпраменьвала настаўніца нябачнае душэўнае цяпло, давер. Умела яна заняць вучняў, магла без раздражнення па некалькі разоў вяртацца да незразумелага пытання, па вачах чытала настрой школьнікаў і заўсёды адчувала, хто чым дыхае.

Алінін клас быў апошнім выпускам класнага кіраўніка. Вера Паўлаўна была ўжо на пенсіі, сказала, што стамілася, што хочацца застацца сам насам з агародам, кветнікам і кошкай; ляжаць у палісадніку з кніжкамі, глядзець любімыя савецкія кінафільмы, перакідвацца навінамі з суседкамі і нікуды не спяшацца. Адно прасіла: па магчымасці званіць, пісаць, паведамляць, як ідуць справы ў дзетак, як склалася іх жыццё.

Аліна адклала фотаздымак, уздыхнула. Цвёрда вырашыла: перад Днём настаўніка паедзе ў госці разам з мужам і двухгадовай дачкой Юлькай. Купіць для Веры Паўлаўны фруктаў, яе любімы «Кіеўскі» торт, кветкі. Пасядзяць, як часта бывала ў школьныя гады і ў той, незабыўны для Аліны, вечар-споведзь...

* * *

...Аліна не спала якую ноч запар. Думкі-вужакі абвілі голаў, прытуліліся ля сэрца і, здавалася, вось-вось перакрыюць дзяўчыне дыханне... І было ад чаго не спаць і задыхацца: Аліне патрэбна было зрабіць выбар. Каму сказаць — не павераць! Ёй патрэбна выбраць — за каго выйсці замуж! Па прывычцы націснула на кнопку — рассыпала святло настольная лямпа. Аліна дастала з патаемнай шуфлядкі ручку і «Дзённік жыцця», разгарнула тоўсты сшытак і пачала дробнымі літарамі сыпаць думкі на чысты ліст.

«Міхась ці Юрка? Юрка ці Міхась? Ох, Аліна! Сама сабе дзіўлюся. Як магла? Задурыла галаву абодвум хлопцам: аднаму ў Мінску, другому дома, у вёсцы. Дзённічак, сябра мой верны! Сама не разумею, як так атрымалася. Пачыналася з малога: танцы-абдыманцы, цукеркава-букетны перыяд, потым пацалункі і з адным, і з другім... І ўсё думала, што вось-вось абразумлюся, спыню выбар на адным, бо грэх жа з двума «любовь-морковь» круціць, ды і выкрыцца можа. А дні ляцелі! Дзённічак! Юрка мяне да бацькоў кліча — знаёміцца. Так і сказаў: «Мае чакаюць сустрэчы з будучай нявесткай!» Мішка сустрэў з аўтобуса з вялізным букетам, павіншаваў дыпламаваную настаўніцу і сказаў, каб на выхадныя чакала сватоў... Здаецца, што абодва сэрцу мілыя. Юрка — хлопец гарадскі, прыгажун, гляне — мурашкі па скуры, весялун, у любой кампаніі з ім не сумна. І зарабляе добра. І кватэра свая... Мішка, як маці кажа, апошнюю кашулю з сябе здыме, каб мяне сагрэць, не п'е, не паліць. Мо занадта паслухмяны, але не сказаць, каб цялё, можа і прыкрыкнуць, нездарма ў калгасе пасаду галоўнага энергетыка ўжо атрымаў, а хлопец жа не тутэйшы, па размеркаванні пасля інстытута два гады назад прыехаў.

Як жа не пакрыўдзіць кавалераў? Як дасягнуць унутранай гармоніі? Трэба выбіраць, дзённічак, трэба думаць...»

Вось і думала, не спала дзяўчына. Яе маці падабаўся Мішка, таму прызнацца баялася, што грашыць з двума хлопцамі. І рашылася наведацца да Веры Паўлаўны, у суседнюю вёску.

На вуліцы шарэла. Настаўніца сустрэла сваю выпускніцу цёпла. Абняла па-мацярынску, стала завіхацца, паставіла чайнік на пліту. Стол накрылі пад уяўнай альтанкай: некалькі дошак, збітых паміж сабой, былі шчыльна абвіты дзявочым вінаградам, утварыўшы сапраўдную страху. Напэўна, і буйныя кроплі дажджу не перашкодзілі б чаяванню і сардэчнай размове вучаніцы і настаўніцы.

— Сама сабе дзіўлюся, Вера Паўлаўна, як сталася так... Як змагла столькі часу з абодвума сустракацца? Сорамна прызнацца. Ну, як ёсць! Таму і прыйшла да Вас на пакаянне. Па дапамогу, па параду...

— Дзевачка мая залатая! Што грызе пачуццё віны, гэта добра. Але ты так віртуозна столькі часу водзіш за нос хлопцаў, а сваё сэрца не чуеш. Нельга мне ў лёс твой умешвацца, раіць ці пераконваць... Усё трэба самой табе ўзважыць: як хлопец да цябе адносіцца, як тваім здароўем і настроем цікавіцца, як на дапамогу спяшаецца... Важна, што цябе да яго прыцягвае. Раўнівы — дрэнна, скупы — дрэнна, сяброў вакол яго процьма, а ты на другім месцы — дрэнна. Па першым клічы бяжыць на дапамогу — добра, бацькоў ды Бога шануе — добра! Прафесію і працу з добрым заробкам мае — таксама важна, без грошай цяжка жыць. З твару вады не піць, але калі знешнасць раздражняе, не твой чалавек... Ох, мая ты дарагая! Разумею тваё хваляванне, бо баішся і сама памыліцца, і хлопцаў да істэрыкі давесці. Толькі камусьці з іх у любым выпадку будзе балюча. Ты, Аліначка, успомні, каго першага з іх спаткала. Бо, калі б яго кахала, то, мабыць, не падпусціла б да сябе другога. Я са сваім Пятровічам больш за дваццаць гадоў пражыла, дачку выгадавалі, удавой каторы год жыву, а ніколі ў думках нават не ўявіла, што на яго месцы мог бы іншы быць. Дам табе яшчэ адну параду: даверся інтуіцыі — з кім бы па жыцці хацела весці за руку сваіх дзетак, якія, як дзве кроплі вады, будуць падобныя на мужа? Смешна? А ты ўяві!»

* * *

Белая «Аўдзі» павольна ўязджала на вясковую вуліцу, пакалыхвалася з боку на бок на выбоінах. У гэтай вёсцы машыны — рэдкасць: дзеці на выхадныя калі-нікалі завітваюць ды аўталаўка тры разы на тыдзень. А жыхароў па пальцах палічыць можна.

Аліна пазнала знаёмую ваколіцу. Па-ранейшаму стаяць дзве старэнькія ніцыя вербы ля крайняй хаты, а побач — тоўстая груша-дзічка ля плота Веры Паўлаўны. Цягне галіны насустрач прыезджым, бы страчае дарагіх гасцей.

— Вы з Юлькай пакуль пасядзіце ў машыне, — папрасіла мужа. — Я ў разведку.

Выскачыла з машыны з вялікім букетам белых руж, патупала да брамкі. Паспешліва, у прадчуванні, што вось-вось абдыме за плечы Веру Паўлаўну. Але... зачынена рыпучая брамка. Кінулася ў вочы зарослая густой травой сцяжынка. Стары стомлены слімак прымасціўся на травіцы. Дзяўчына адчыніла веснічкі, пайшла па траве да дзвярэй, адчуваючы, як імкліва падае настрой. Няўжо няма гаспадыні дома? На дзвярах — цяжкі іржавы замок. Кінула вокам на кветнік і агарод. Паласнула думка: «Не... У Веры Паўлаўны не можа быць такі агарод. У яе каліва пустазелля цяжка было знайсці». Адчуваючы любоў гаспадыні, у знак удзячнасці заўсёды буялі ў палісадніку розныя кветкі. А сёння — адны вяргіні цягнуць свае галовы да восеньскага сонейка. Раскашавала толькі барвова-мядовая ліяна дзявочага вінаграду. Аліна павярнула да выхаду. Вочы напоўніліся слязьмі. Але надзея не пакідала. Ішла шукаць суседку. А яе і шукаць не трэба, цётка Валя тут як тут. Прызнала Аліну. Павіталіся.

— А я думаю, машына незнаёмая, хто тут у Верачкі заблукаў.

— А не падкажаце, дзе Вера Паўлаўна? Я вось да Дня настаўніка сюрпрыз хацела...

— Не атрымаецца сюрпрыз, мая харошая. Спазнілася ты. Забрала Верачку напрыканцы вясны дачка да сябе ў горад...

— Ой, то можа тэлефон іх дасце ці адрас? — перарвала суседку Аліна і ўзрадавана працягнула: — Пастараемся звязацца і заскочыць.

— Заскочыць-то можна! Толькі не стрэне яна вас.

— У бальніцы?

— Не... Там ужо... — суседка падняла ўказальны палец левай рукі да аблокаў. — Акурат на Зельны сышла. На свята. Інсульт. Пакінуў дух нашай Верачкі хату сіратой. Толькі вецер у трубе плача ды вяргіні во, — сумуюць у жалобе. У горадзе пахавалі, ля мужа.

Знямела душа... Аліна ціха сказала цётцы: «Дзякуй», — і пайшла... Не, не да машыны. Завярнула да ўяўнай альтанкі пад вінаграднікам, прысела на лавачку, на якой сядзела пры апошняй сустрэчы з настаўніцай, спавядаючыся. Быццам бы і не мінула чатыры гады... Аліна апусціла на траву букет, склаўшы рукі, як перад абразам, пачала гаварыць:

— Чаму я не прыехала крыху раней, Вера Паўлаўна? Чаму не званіла вам? Толькі паштоўкі слала. Даруйце. Пахваліцца асабліва не было чым. Хіба што ўдалым пачаткам прафесійнай дзейнасці. З першых месяцаў дапамагаў Ваш стыль адносін з вучнямі, я адчувала сябе на ўроку, бы рыба ў вадзе, хоць вучні гарадскія, а я — малады спецыяліст. Усе Вашы парады памятала! Адна толькі не спрацавала. На вяселле да мяне Вы не змаглі прыехаць. А мой выбар быў зроблены на карысць таго, на каго хацела, каб былі падобныя дзеці. Прыгажуньку Юлечку нарадзіла. Але сямейную ідылію стварыць не атрымалася ў нас з Юркам. Не сям'я аказалася галоўным для мужа. Сумна было яму з намі доўгімі зімовымі вечарамі, сталі раздражняць дзіцячыя праблемы, дазваляў сабе не начаваць дома, часам хаваўся ў ванным пакоі і ціхенька размаўляў па тэлефоне... Вядома, я ўсё разумела: у мужа з'явілася каханка. Калі Юльцы споўніўся годзік, падала на развод і з'ехала дамоў, да бацькоў. І да Міхася... Ён чакаў! Так і сказаў пры развітанні, сціснуўшы мяне за плечы: «Ну, схадзі замуж, а я буду чакаць». Моцна пякло абаім расстанне. Не паверыла словам, а ён дачакаўся! Вось ужо паўгода, як разам мы. У раённым цэнтры жывём. Юлька яго татам заве! Нават прымусіў мяне ад аліментаў адмовіцца. Выправіла я памылку сваю, бо на прыгажосць і багацце, а не на чалавечнасць і вернасць паставіла. Прычым памятала і яшчэ адну Вашу параду: Мішка быў другі, з ім пазнаёміліся на два месяцы пазней, чым з Юркам. Але ведаеце, чаму дзіўлюся: вядзём за ручку Юльку, і мне здаецца, што яна — як дзве кроплі вады — Міхаська! І ўвесь свет абняць хочацца...

Даруйце мне, Вера Паўлаўна! Я часта пра Вас думала. Вельмі часта, — Аліна падняла вочы да шаравата-сіняга неба і з палёгкай выдыхнула: — Хай Вам там будзе лёгка. Дзякуй, мой мудры Настаўнік. Я буду ісці па жыцці з мэтай, каб і мае вучні прыходзілі да мяне на споведзь душы. Заслужыць гэта вельмі няпроста...

Аліна ўстала з лавачкі, узяла букет. Крыштальныя градзінкі сыпанулі з яе вачэй. Краем вока ўбачыла, што ля веснiц стаіць Міхась з Юлькай на руках. Яна падышла да дзвярэй, павярнула вялікі замок так, каб можна было ўсунуць у яго ружы: «Гэта Вам... З Днём настаўніка!»

# Другі месяц зімы сёлета будзе самым капрызным

**Студзень — самы халодны зімовы месяц. Тэмпература паветра на тэрыторыі краіны вагаецца ў невялікіх межах, лічаць спецыялісты. Сярэдняя тэмпература днём — каля мінус 5 градусаў. І характэрная яна для поўдня і паўднёвага захаду краіны. У цэнтры і на паўднёва-ўсходнім схіле беларускага ўзвышша слупок тэрмометра можа апусціцца да мінус 10 градусаў. На поўначы краіны студзень больш суровы. У Віцебску па начах тэмпература падае да 16 марозу.**

**Снег выпадае, як правіла, у снежні. А да студзеня снежнае покрыва ўжо даволі ўстойлівае (не заўсёды і не ўсюды). Сонца ў студзені выглядае даволі рэдка, захоўваецца воблачнае, але сухое надвор'е.**



## Абсалютны зімовы холад і анамальнае цяпло

Галоўныя сіноптыкі краіны адзначаюць, што студзень і люты будуць адносна мяккімі і няўстойлівымі. Ды і па прагнозах сусветных цэнтраў зіма чакаецца цёплай. Сіноптыкі мяркуюць, што сярэднесезонная тэмпература ў Беларусі будзе на 1-2 градусы вышэй за норму і складзе ў сярэднім мінус 5,5 градуса.

У першай палове другога месяца зімы магчымыя істотныя маразы, аж — да 25 марозу. Прычынай адмоўных тэмператур, багатых ападкаў і моцнага ветру будзе арктычны цыклон, які пры сутыкненні з умеранымі паветранымі масамі ўтворыць халодныя франты. Самыя нізкія тэмпературы прагназуюцца ў паўночных раёнах краіны. Пахаладанне будзе не занадта доўгім, яно перыядычна можа змяняцца пацяпленнем.

Самай халоднай зімой за ўсю гісторыю метэаралагічных назіранняў у Беларусі была зіма з 1939 на 1940 год, калі сярэдняя тэмпература за тры зімовыя месяцы склала мінус 10,9 градуса, што на 6,9 градуса ніжэй за норму. У гэтую зіму былі зарэгістраваныя абсалютныя мінімумы тэмпературы паветра за ўвесь перыяд назірання. Так, абсалютны мінімум тэмпературы паветра на тэрыторыі Беларусі, які не перавышаны да гэтага часу, быў адзначаны 17 студзеня 1940 года — мінус 42,2 градуса ў пасёлку Слаўнае Талачынскага раёна і мінус 41 з паловай у вёсцы Бычыха Гарадоцкага раёна.

Гэты дзень быў выключна халодным і для Мінска, дзе мінімальная тэмпература паветра апусцілася да мінус 39,1 градуса. Данае значэнне з'яўляецца абсалютным мінімумам тэмпературы паветра для сталіцы. А самая халодная навагодняя ноч за ўвесь перыяд інструментальных назіранняў у Мінску была адзначана 1 студзеня 1941 года, калі тэмпература паветра апусцілася да мінус 29,8 градуса.

Зіма з пункту гледжання кліматолагаў надыходзіць тады, калі сярэднясутачная тэмпература паветра апускаецца ніжэй за нуль і ўтрымліваецца ў такім становішчы больш за пяць дзён. У Беларусі на мяжы 2019—2020 гадоў гэтага так і не адбылося.



«Сярэдняя тэмпература паветра ў тым зімовым сезоне склала плюс 1,5 градуса, што на 5,5 градуса вышэй за кліматычную норму. За ўсю гісторыю метэаназіранняў у нас зімы са станоўчымі сярэднімі тэмпературамі не адзначалася ні разу. Да гэтуль такімі анамальна цёплымі бывалі толькі асобныя зімовыя месяцы: напрыклад, нават люты 2020 года быў са знакам плюс. Але каб уся зіма — такое фіксавалі ўпершыню», — распавялі ў Белгідрамеце.

Тады, у 2019—2020-м усе тры зімовыя месяцы былі анамальна цёплымі: у сярэднім плюс 1,9 градуса ў снежні, плюс 1,1 у студзені, плюс 1,6 у лютым. Адхіленне тэмпературы ад кліматычнай нормы ў кожным з месяцаў перавышала 5 градусаў.

Метэаназіранні на тэрыторыі нашай краіны вядуцца ўжо больш за сотню гадоў. Так што можна з упэўненасцю казаць, што знакавая зіма была самай цёплай у нашай краіне, пачынаючы з 1881 года. Да гэтага рэкардсменам лічыўся зімовы сезон 1989—1990 гадоў, калі сярэдняя тэмпература паветра была мінус 0,1 градуса.

А самая цёплая «галоўная» ноч за ўсю гісторыю назіранняў у Беларусі была 1 студзеня 2023 года, калі падчас бою курантаў тэмпература складала плюс 4,9 градуса, паведамілі спецыялісты аддзела вывучэння змянення клімату Белгідрамета. Па іх словах, павышэнне тэмпературы на працягу ночы прыпынілася, і да 6 гадзін раніцы яна дасягнула плюс 6,5 градуса.

## Холад часам прарываецца

Пазней да гэтай адзнакі (да 40 марозу) тэмпература ў Гарадоцкім раёне набліжалася ў 1956 годзе. А далей моцныя маразы сталі драбнець. З апошняга — мінус 35 градусаў у 2000 годзе. Меж навіта на Гарадоцкай зямлі, калі верыць шматгадовым метэаназіранням, знаходзіцца полюс холаду ў нашай краіне. Досыць холадна было і ў студзені (24) 2010 года. Тады ноччу была зафіксавана і самая нізкая тэмпература паветра — мінус 32 градусы — гэта адбылося на метэастанцыі ў Пружанах.

А самы (найбліжэйшы) халодны Мінск быў у 2006 годзе. Лічылася, што ў сярэднім кожны год сталіца адчувае 25-градусны мароз. Няхай на не вельмі працяглы час, але ўсё ж. Па факце — гэтага ўжо няма. За апошнія гады тэмпературны мінімум студзеня няўхільна расце. Самы моцны, за апошнія 40 гадоў, мароз быў у 2006 годзе, калі ў канцы студзеня тэмпература апусцілася да мінус 28,6 градуса.

## Адлігі цяпер не анамалія

У нашай краіне адлігі вельмі частыя. У мяне няма дакладных даных па кожным месяцы ўсіх мінулых зім, але з'ява гэта настолькі звычайная, што серыя ў 30 дзён без адлігі стала б ледзь не абсалютным рэкордам па сапраўднай халоднай зіме.

Аднак характар у гэтай зімы будзе няўстойлівы, што абумовіць панаванне то вільготных цёплых паветраных мас з паўднёвых шырот, то халодных, калі з поўначы і паўночнага ўсходу пачне пранікаць арктычнае паветра, адзначаюць сіноптыкі. Спецыялісты паабяцалі ў гэтым зімовым сезоне шмат ападкаў, у тым ліку снегападаў і завей. Таксама не абыдзецца без моцнага ветру і туманаў. Калі ацэньваць студзень у цэлым, то ён будзе адносна мяккім, снежным, але няўстойлівым і капрызным.

## Аб народных прыкметах і тэхналогіях у прагнозах

Прагноз — складаны навукаёмісты працэс, які ўлічвае масу фактараў. Пры яго складанні праводзіцца ацэнкі стану атмасферы і характарыстык паветраных мас. Выкарыстоўваць пры гэтым народныя прыкметы ненавукова, лічаць спецыялісты. Праўда, некаторыя з іх маюць цалкам навуковае тлумачэнне. Напрыклад: калі ластаўкі лётаюць нізка, то чакай дажджу. Напярэдадні дажджу ў атмасферы адбываюцца ваганні вільготнасці і ціску, і гэта змушае птушак апускацца ніжэй, каб знайсці ежу.

Навуковы прагрэс, несумненна, адбіваецца на дзейнасці метэаслужбы. Велізарны скачок наперад у прагназаванні надвор'я здзейсніў у 60-х гадах мінулага стагоддзя, пасля запуску штучных спадарожнікаў Зямлі. Павысілі якасць гэтай працы і камп'ютарныя тэхналогіі. Цяпер дакладнасць прагнозаў на 4—6 сутак наперад такая, якой у сярэдзіне ХХ стагоддзя была на адны суткі. Але як бы ні развівалася навука і тэхніка, на абсалютна дакладны прагноз разлічваць пакуль не прыходзіцца.

Як вынікае з аналізу паказчыкаў надвор'я, у апошнія дзесяцігоддзі ў Беларусі самым цёплым зімовым месяцам стаў снежань, на працягу якога сярэдняя тэмпература паветра не дасягае і мінус 4 градусаў. Акрамя таго, снежань яшчэ б'е рэкорды па нестабільнасці надвор'я — у гэтым месяцы часцей за ўсё здараюцца адлігі і ападкі ў выглядзе мокрага снегу. Па даных навукоўцаў, за апошнія 35 гадоў снежань у Беларусі стаў цяплей на 0,5 градуса.

Пры гэтым самым халодным месяцам у Беларусі ў апошнія дзесяцігоддзі стаў студзень. Сярэдняя тэмпература гэтага месяца на 1 градус халадней, чым у снежні. Пацяпленне клімату аказала і ўплыў на снежнае покрыва ў Беларусі, даўгавечнасць якога ў цэлым за сезон скарацілася на 11—12 дзён.

## Цёплы рэкорд года і доўгатэрміновыя прагнозы

Паводле прагнозных даных Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, сярэдняя тэмпература ў 2023 годзе можа быць амаль на 1,5 градуса вышэй, чым у базавым даіндустрыяльным перыядзе 1850—1900 гадоў.

Раней самымі цёплымі за ўвесь перыяд назіранняў лічыліся 2016 і 2020 гады.

На жаль, беларускія сіноптыкі не даюць доўгатэрміновых сінаптычных прагнозаў. Іх робяць толькі некалькі буйных сусветных цэнтраў надвор'я — у Вашынгтоне, Мельбурне і Маскве. Глабальныя прагнозы на сезон для значных тэрыторый робяць з дапамогай матэматычных мадэляў разлікаў. Пры гэтым навукоўцы з вялікай доляй упэўненасці кажуць, што гэтай зімой будуць і адлігі, і перыяды досыць моцных маразоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Пры праясненнях — да 27 марозу!

**Марознае дыханне зімы ў гэтым сезоне мы адчулі яшчэ ў канцы лістапада, а ў пачатку снежня прыйшлі маразы, якія часам «зашкальвалі» на цэлых 7 градусаў ніжэй за норму. З сярэдзіны снежня нам стала здавацца, што на гэтым зіма вычарпала свае марозныя «нарыхтоўкі», а дарма. Ужо ў першай дэкадзе студзеня нас чакае вельмі кантраснае надвор'е, калі дождж будзе мяняцца на снег, а малы тэмпературны плюс — на ўпэўнены мінус, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.**

Вельмі складанае надвор'е будзе сёння. 4 студзеня часам будзе ісці снег, ночу па ўсходзе краіны месцамі моцны снег. У начныя гадзіны па Брэсцкай вобласці, раніцай і днём па паўднёва-заходняй палове краіны ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі галалёд, наліпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад нуля па паўднёвым захадзе да мінус 20 градусаў па паўночным усходзе. Днём будзе таксама кантрасна — ад нуля да плюс 4 градусаў па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці, а таксама да мінус 16 градусаў па ўсходзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

На большай частцы тэрыторыі краіны ў пятніцу будзе ісці снег і мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра пачне паніжацца, калі ўначы чакаецца ад мінус 3 градусаў па поўдні да мінус 18 градусаў па поўначы, а максімальная днём складзе 6—13 марозу, а ў паўднёва-заходніх і паўднёвых раёнах ад нуля да мінус 5 градусаў.

Снежнае нашэсце амаль спыніцца ўжо ў суботу. У гэты дзень месцамі па краіне магчымы кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад 6 марозу па паўднёвым захадзе да мінус 18 градусаў па поўначы краіны, пры праясненнях 19—23 марозу. Максімальная тэмпература днём ад мінус 6 да мінус 12 градусаў, па поўначы краіны 13—16 марозу, па поўдні — 3—5 градусаў ніжэй за нуль.

У нядзелю нас чакае чыстае неба, а ў гэты час маразы будуць толькі мацнець. У гэты дзень месцамі па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы 15—22 марозу, пры праясненнях ад мінус 23 да мінус 25 градусаў, па поўдні і паўднёвым захадзе — 9—14 марозу. Максімальная тэмпература днём чакаецца ад мінус 9 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 18 градусаў па паўночным усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра мінімальная ноччу складзе ад мінус 15 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 23 па паўночным усходзе, пры праясненнях — 25—27 марозу. Максімальная тэмпература днём 9—16 марозу, па паўночным усходзе — да 18 градусаў ніжэй за нуль.

І ў аўторак месцамі па краіне кароткачасовы снег і слабая мяцеліца. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад 12 марозу па паўночным захадзе да мінус 23 градусаў па паўднёвым усходзе краіны. Днём максімальныя халады ўжо адступяць, чакаецца мінус 1 — мінус 8 градусаў, у паўднёва-ўсходніх раёнах — да 10 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «Новае жыццё» з новага года

## Як правільна будаваць планы, каб потым не атрымалася, «як заўсёды»

**У многіх прынята пачынаць нешта новае з першага чысла, панядзелка, і ўжо Новы год тут увогуле асаблівая дата. Але ці варта прывязваць да яе пачынанні? Калі дакладна вырашылі мяняць жыццё з новага года, з чаго трэба пачынаць? І чаму так важна падвесці вынікі мінулага года? Як зрабіць так, каб навагодняе жаданне перамен не забылася ўжо да канца святочных выхадных?**



### Не трэба рэзкіх крокаў

Псіхолагі раяць не планаваць глабальных перамен з новага года. Многія цешаць сябе думкамі, што разам з новым каляндарным годам яны пачнуць заадно і новае жыццё. Гучыць натхняльна, толькі вось гэтая ідэя насамрэч не вельмі жыццяздольная.

Загвоздка ў тым, што, жадаючы пачаць новае жыццё, большасць з нас думае аб радыкальных зменах. Толькі вось для псіхікі любыя змены, нават добрыя, — гэта стрэс. Ёй больш падабаецца звыклае, адзначае **псіхолаг Вольга ВІКТАРАВА.**

Вось чаму ідэя з новым жыццём можа не скласціся:

— усё мяняецца занадта кардынальна, вы не вытрымліваеце і вяртаецеся назад;

— вы хочаце перамен, але не вельмі разумееце, навошта вам гэта трэба;

— пакуль усе вакол адпачываюць і расслабляюцца, вы заганяеце сябе ў дадатковы стрэс.

Калі змен сапраўды хочацца, варта прааналізаваць асноўныя сферы жыцця (здароўе, сям'я, праца і т. п.) і адказаць на пытанне, што ў іх не задавальняе, а затым уявіць жаданую карціну. Галоўнае пры гэтым разумець, чаго і навошта хочацца і чаму гэта важна.

Наступнае дзеянне — прадумаць невялікія крокі без прывязкі да дат і абавязковасці. Любая глабальная змена — гэта дарога з невялікіх і цалкам рэалізаваных крокаў, адзначае псіхолаг. Адзін з іх можна, але неабавязкова, зрабіць прама зараз.

### Спачатку падвядзіце вынікі

Памятайце, што перш чым будаваць планы на новы год, можна падвесці вынікі года мінулага. Прычым рабіць гэта трэба, нават калі ён быў для вас не вельмі ўдалым — і вось чаму.

Па-першае, гэта магчымасць нарэшце звярнуць увагу на сябе. У паўсядзённым жыцці, як правіла, людзі робяць гэта не так часта, як трэба было б. Сам факт звароту ўвагі на ўласныя думкі аб мінулым годзе, на ўласныя пачуцці — вельмі важная праца, кажа **псіхолаг Дар'я БАРЫСЯК.** У такія моманты мы перасоўваем фокус увагі з навакольнага свету на сябе і пачынаем лепш заўважаць, у чым нашы патрэбы, чым мы задаволеныя, а чым не, і чаго наогул жадаем.

Па-другое, гэта магчымасць заўважыць і адзначыць змены, якія з вамі адбыліся. А гэта не так проста, як здаецца: строга кажучы, гэтаму навыку псіхолагі спецыяльна вучаць у працэсе тэрапіі, таму што пераважная большасць людзей не ўмеюць заўважаць і адзначаць свае змены — і пачуццёвыя, і кагнітыўныя, і паводніцкія.

Нават дынаміку ў становішчы ўласных спраў бывае ацаніць няпроста. «Было добра, стала дрэнна» — гэта не ацэнка змен. Патрэбна канкрэтыка.

Па-трэцяе, гэта магчымасць атрымаць рэсурс у працэсе падвядзення вынікаў года. Як гэта працуе? Калі мы не даём сабе магчымасць спыніцца і паглядзець, што канкрэтна было зроблена, якія змены адбыліся і якія вынікі былі атрыманы, мы «звальваемся» ў звышабагульненне, а таксама абясцэньванне.

Звышабагульненне — гэта калі мы на аснове аднаго якога-небудзь выпадку робім глабальныя высновы. Выглядае гэта прыкладна так: «У тым годзе я заваліў праект, таму год быў дрэнны, а я няўдачнік». Але ці так гэта на самай справе? А ці было нешта яшчэ?

**«Вызначыце сваё новае жыццё. У чым яно будзе заключацца? Якіх сфер жыцця датычыцца? Падумайце, чаго вы хочаце ад новага жыцця? Можа быць, гэта паляпшэнне здароўя, кар'ернага росту ці развіцця асабістых адносін. Запішыце тое, што хочаце ўбачыць у сваім новым жыцці як мэты і разбіце іх на больш дробныя задачы — на штодзённыя або штотыднёвыя, каб мець дакладны план дзеянняў».**

Калі вы возьмецеся дэталізавана ўспамінаць мінулы год, высветліцца, што было шмат усяго яшчэ — у тым ліку таго, за што варта сябе пахваліць. А калі вы звяртаеце ўвагу на такія справы і сваю ролю ў іх, вы атрымліваеце задавальненне, а яно — адна з крыніц рэсурсу, які дазваляе рухацца наперад.

А на звышабагульненнях далёка вы не паедзеце — хутчэй, згубіце матывацыю і атрымаеце адчувальны ўдар па сваёй самаацэнцы.

Нарэшце, па-чацвёртае, гэта магчымасць прааналізаваць, што было зроблена, а што зрабіць не ўдалося — і чаму. Цалкам магчыма, што тое, што зроблена не было — добрыя мэты на будучы год, якія ўжо будуць дапоўнены вопытам і разуменнем. Але таксама магчыма, што, падумаўшы, вы прыйдзеце да высновы, што тое, што не зроблена — не зроблена не проста так, у рэальнасці вы гэтага не хочаце і вам туды проста не трэба. І гэта таксама вынік.

### Не параўноўвайце сябе з іншымі

Для таго каб падвесці асабістыя вынікі года, найперш варта сабе нагадаць пра тое, што гэта менавіта вашы вынікі года, і таму варта адмовіцца ад параўнання сябе з іншымі.

Самае правільнае параўнанне — гэта параўнанне сябе з сабой на лініі часу.

Калі год для вас апынуўся складаны, вы будзеце неўсвядомлена імкнуцца да таго, каб зваліць усё ў адну кучу пад сцягам некалькіх дрэнных падзей: погляд атрымаецца тунэльным. Таму пастаўцеся да падвядзення вынікаў года як да задачы, у рамках якой вам неабходна пашырыць свой погляд на пражыты год: пазбягайце звышабагульненняў і імкніцеся да дэталізацыі і канкрэтыкі.

Дрэнныя падзеі здараюцца, і мы не заўсёды ў сілах на іх паўплываць. У такім выпадку іх варта проста прыняць: «Так, было, і гэта сумна». Але ж было і шмат усяго іншага — паспрабуйце ўключыць гэтыя выключэнні ў свой спіс.

Памятайце, што жыццё не абмяжоўваецца толькі адной сферай. Падумайце пра працу, сям'ю, сяброў, самаразвіццё, пра матэрыяльны і духоўны бок жыцця, а таксама пра тое, як удавалася адпачываць сёлета. Каб падвесці вынікі года, можна таксама задаць сабе некалькі пытанняў.

• Што новага для сябе вы даведаліся сёлета? (Гаворка не толькі пра нейкія адукацыйныя курсы і навучанне, глядзіце на рэчы шырэй.)

• Якія важныя падзеі адбыліся ў гэтым годзе і як яны на мяне паўплывалі? Што я, дзякуючы ім, атрымаў?

• Якія перамогі і дасягненні ў мяне былі сёлета? Дзякуючы чаму я іх дасягнуў? Якія мае якасці паўплывалі на атрыманне поспеху? (Імкніцеся глядзець шырэй.)

• Чаму мяне навучылі дрэнныя падзеі, якія адбыліся са мной у гэтым годзе?

• Чаго я не дасягнуў у гэтым годзе і па якіх прычынах? Ці варта гэтыя мэты ўключыць у план наступнага года, ці яны страцілі для мяне сваю значнасць?

І памятайце, што свет не чорна-белы, і нават самы цяжкі год нясе ў сабе не толькі дрэнныя падзеі, але і добрыя, а таксама вучыць чамусьці важнаму, што спатрэбіцца ў будучыні. Правільнае ў адносінах да сябе падвядзенне вынікаў года дапаможа знайсці рэсурс, каб рухацца далей больш упэўнена, з новымі планамі і ідэямі.

### Планы павінны быць рэалістычнымі

Пасля падвядзення некаторых вынікаў мінулага года можна пачаць планаваць новае жыццё.

— Вызначыце сваё новае жыццё. У чым яно будзе заключацца? Якіх сфер жыцця датычыцца? Падумайце, чаго вы хочаце ад новага жыцця? Можа быць, гэта паляпшэнне здароўя, кар'ерны рост ці развіццё асабістых адносін. Запішыце тое, што хочаце ўбачыць у сваім новым жыцці, як мэты і разбіце іх на больш дробныя задачы — на штодзённыя або штотыднёвыя, каб мець дакладны план дзеянняў, — раіць **псіхолаг Алена ДЗЬЯЧКОВА.**

Спецыяліст прапануе яшчэ некалькі канкрэтных спосабаў для змены свайго жыцця, якія можна пачаць рабіць з новага года:

— візуалізуйце поспех: уявіце сабе, як будзеце адчуваць сябе, калі ў вас наступіць ваша новае жыццё. Візуалізацыя дапамагае падтрымліваць матывацыю і веру ў свае магчымасці;

— каб жыць новае жыццё па-новаму, рабіце нешта новае кожны дзень ці дзейнічайце па-іншаму;

— усталюйце рэалістычныя чаканні: памятайце, што змены патрабуюць часу і намаганняў. Будзьце гатовыя да таго, што не ўсё пойдзе гладка, і не падайце духам пры ўзнікненні цяжкасцяў;

— стварыце вакол сябе асяроддзе, якое падтрымлівае, — майце зносіны з людзьмі, у якіх падобныя з вамі мэты, каштоўнасці і інтарэсы. Рэгулярна нагадвайце сабе аб сваіх дасягненнях і прагрэсе;

— будзьце гатовыя да змен: новае жыццё можа запатрабаваць ад вас прыняцця новых рашэнняў і адмовы ад старых звычак. Будзьце гнуткімі і адкрытымі для змен, якія рыхтуе ваша новае жыццё.

### Кола балансу

Ёсць адна вельмі папулярная, простая і эфектыўная практыка «Кола балансу». На лісце паперы намалюйце круг і падзяліце яго на некалькі роўных сегментаў. Кожны сегмент — гэта важная сфера вашага жыцця або тое, што б вам хацелася. Сегменты і іх колькасць вы вызначаеце самі, прыкладны пералік: здароўе, адносіны, кар'ера, заробак, сябры, забавы і адпачынак і інш., духоўнае развіццё. А далей адзначце, на колькі балаў па 10-бальнай шкале вы ацэньваеце сваю задаволенасць на сённяшні дзень.

З гэтага графіка наглядна будуць бачныя тыя сферы, якія вы пакуль не рэалізуеце. Па кожнай такой сферы можна канкрэтызаваць, што менавіта вы тут хочаце, і намеціць план дзеянняў па рэалізацыі. У плане павінны быць і маленькія, і вялікія дзеянні.

### Не адкладвайце на заўтра...

Але ўсім нам час ад часу ўласцівая пракрастынацыя — пастаяннае адкладванне важных спраў. Што ж адчувае і з якімі псіхалагічнымі праблемамі сутыкаецца чалавек, калі не атрымлівае жаданага і не выконвае свае мэты?

Гэта засмучэнне, расчараванне, злосць, крыўда. Калі чалавек адмаўляецца рухацца ў бок таго, што для яго сапраўды важна, — рана ці позна ён сутыкнецца з выгараннем. Калі здаецца, што ты не жывеш сваё жыццё, а проста існуеш, губляецца цікавасць да ўсяго. Магчыма, нават разаўецца дэпрэсія.

Калі ж не ўдаецца ажыццяўляць нейкія не такія значныя задачы, то абурэнне, хутчэй, будзе кароткім і нямоцна адаб'ецца на стане ў цэлым.

І апошняе: каб дабіцца жаданых вынікаў у новым годзе, важна ставіць перад сабой выканальныя мэты. Лепш вылучыць адзін важны кірунак. Гэта дазволіць разумець, што канкрэтна трэба зрабіць, каб атрымаць жаданы вынік.

Кожны тыдзень трэба глядзець, чаго ўжо ўдалося дасягнуць. Многія дарослыя перад Новым годам загадваюць невыканальныя жаданні. Больш за тое, яны часта перакладаюць адказнасць за выкананне сваіх жаданняў на вонкавыя сілы, тым самым пераконваючы сябе, што самі не могуць вырашыць якую-небудзь праблему. Псіхолагі папярэджваюць, што мэты ў такой сітуацыі цяжка будзе дасягнуць.

Каб не здарылася так, што дадзеныя сабе навагоднія абяцанні вы забылі ўжо да канца святочных выхадных, то калі вы сапраўды нечага хочаце, неабавязкова чакаць навагодняй ночы ці панядзелка — дзейнічайце прама цяпер.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

